Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЖНІВЕНЬ 15 1933 г. АУТОРАК № 179 (4729) Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

УСІМ СТАРШЫНЯМ ГКК І РКК-РСІ

Аб дапамозе органаў НК-РСІ камсамолу ў правядзеньні 3-га ўсесаюзнага рэйду груп „Л. К."

Адкрыты ліст старшыні ЦКК-НК РСІ т. ЛЫЧОВА

Праводзімы ЦК УсеЛКСМ трэці ўсесаюзны рэйд груп «Л. К.» па праверцы гатоўнасьці прыгарадных гаспадарак і прадпрыемстваў да ўборкі зьяўляецца вялікай гаспадарча-палітычнай кампаніяй.

У выкананьне пастановы ЦК УсеЛКСМ аб рэйдзе і ліста т. Рудзута ка «Аб сумесным правядзеньні рэйду групамі «Л. К.» і органамі РСІ» зварачаю вашу ўвагу на неабходнасьць аказаньня ўсямернай дапамогі камсамолу ў гэтай рабоце, уключэньня ў правядзімы рэйд усіх грамадзкіх арганізацый і мабілізацыі на дапамогу групам «Л. К.» усяго актыву НК-РСІ.

Прымоце меры па свайчасовым разгаваньні на выяўленыя ў рэйдзе недахопы і прыцягненьні да суровай адказнасьці вінаватых у гэтых недахопах. Адначасова разгарнеце шырокую работу па прамяваньні лепшых «Л. К.»—удзельнікаў трэцяга ўсесаюзнага рэйду.

Старшыня ЦКК КП(б)Б—НК-РСІ БССР ЛЫЧОЎ.

ЛІКВІДАВАЦЬ НЕДАПУШЧАЛЬНАЕ АДСТАВАНЬНЕ АД ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЬЦІ

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ І ВЫСОКУЮ ЯКАСЬЦЬ УБОРКІ, АРГАНІЗАВАЦЬ БЕСЬПЕРАБОЙНАЕ ПАСТУПЛЕНЬНЕ ЗБОЖЖА ДА МАЛАТАРНІ, АД МАЛАТАРНІ—ДА ДЗЯРЖАЎНАГА ПРЫЁМАЧНАГА ПУНКТУ

Аб загатоўках ільну і пянькі ўраджаю 1933 г.

Пастанова Савету Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б)

СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б) пастанаўляюць:

1. Устанавіць, што ў адрозьненьне ад загатовак збожжа, мяса, малака і бульбы, загатоўкі ільну, канапель, а таксама і іншых важнейшых відаў сырцу для прамысловасьці (бавоўна, буракі) праводзяцца на аснове кантрактацыі.

У сувязі з гэтым растлумачыць, што абавязацельствы, прадугледжаныя ў дагаворах дзяржкаўнага ўсесаюзнага аб'яднаньня Загатлён з калгасамі і адпаасобнымі гаспадаркамі, пад лягаюць бязумоўнаму выкананьню як тым, так і другім бокам і хто ўхіляецца ад выкананьня гэтых абавязацельстваў, будзе адказваць па суду.

2. Устанавіць наступныя тэрміны выкананьня гадавога пляну загатовак:

а) па ільну — сялянскай апрацоўкі — 80 проц. у чацьвертым квартале 1933 году і 20 проц. у першым квартале 1934 году;

б) па пяньцы — сялянскай апрацоўкі — 40 проц. у чацьвертым квартале 1933 году, 20 проц. у першым квартале 1934 году, 40 проц. у другім квартале 1934 году;

в) па ільняным і канапляным семі, ільняной трасьце, саломе і канапляной саломе — 100 проц. да першага студзеня 1934 году;

г) па канапляной трасьце — 50 проц. у чацьвертым квартале 1933 году і 50 проц. у другім квартале 1934 году.

3. Лічыць, што выкананьне пляну загатовак ільну і канапель зьяўляецца першачарговым абавязкам калгасаў, МТС і адпаасобных гаспадарак. Растлумачыць, што ўся прадукцыя ільну і канапель, якая застаецца ў калгасах і адпаасобных гаспадарках пасьля выкананьня пляну здачы дзяржаве па дагаворах, застаецца ў поўным распараджэньні калгасаў і адпаасобных гаспадарак.

4. У сувязі з тым, што ў летнюю загатоўчую кампанію мелі месца выпадкі, калі недобрасумленныя здатчыкі апаўкавалі дзяржаву здачаю недатрапанага ільну і недамятай пянькі, — устанавіць, што ў далейшым абавязацельствы здатчыкаў ільну і пянькі дзяржаве будуць лічыцца выкананымі толькі пры ўмове здачы дзяржаве ільну і пянькі якасьцю ня ніжэй прадугледжанай дагаворам.

Адначасова ўстанавіць павышанае прэміраваньне збожжа тых калгасаў і адпаасобных гаспадарак, якія, выканаўшы свае абавязацельствы па колькасьці, здадуць дзяржаве лён і пяньку якасьцю вышэй прадугледжанай дагаворам.

5. У мэтах павышэньня зацікаўленасьці калгасьнікаў у лепшай апрацоўцы ільну і пянькі абавязаць праўленьні калгасаў:

а) устанавіць цьвёрдыя нормы выхадаў выпрацоўкі валакна з улікам асаблівасьцяй апрацоўкі ільну і канапель;

б) праводзіць разьмеркаваньне даходаў як натуральных, так і грашовых з улікам якасьці зданага кожнай брыгадай і кожным калгасьнікам валакна;

в) усё збожжа, атрыманае ад дзяржавы, і ня менш 80 проц. прадтавараў, атрыманых для прэміраваньня здатчыкаў ільну і канапель, разьмяркоўваць па працадзнёх толькі паміж калгасьнікамі, якія працуюць па ільну і канопліх.

6. Абавязаць камітэт па загатоўках сельгаспрадуктаў пры СНК СССР і Загатлён:

а) арабіць свайчасовы завоз на месцы загатовак збожжа, прамысловых тавараў, алею, макухі;

б) падрыхтаваць усю тэхнічную базу для бесьперабойнай прыёмкі і адгрузкі ільну і канапель;

в) рабіць без якіх-бы там ні было затрыманьняў разьлікі са здатчыкамі.

7. Указаць партыйным і савецкім арганізацыям на важнасьць справы загатовак тэхнічных культур, у прыватнасьці ільну і пянькі ў справе забесьпячэньня прамысловасьці і задаваленьня патрэб насельніцтва ў прадметах шырокага ўжытку, і што лён і канопліі ў ільнаканапляводчых раёнах павінны займаць у рабоце арганізацый такое-ж месца, якое збожжа займае ў асноўных збожжавых раёнах.

Прапанаваць мясцовым партыйным і савецкім арганізацыям зьвярнуць асаблівую ўвагу на выкананьне якасных і колькасных заданьняў па загатоўцы ільну і канапель і прыняць усе меры да ўмацаваньня загатоўчага апарату праверанымі работнікамі.

8. Устанавіць, што побач з адказнасьцю за загатоўкі ільну і канапель з боку камітэту загатовак с.-г. прадуктаў пры СНК СССР і Загатлёну, персанальна адказнымі за выкананьне гадавых пляноў загатовак поўнасьцю і ў тэрмін зьяўляюцца: у рэспубліках, краёх і абласьцях — сакратары нацкампартый, крайкомаў і абкомаў, старшыні СНК рэспублік, старшыні краявых і абласных выканкомаў; у раёнах — сакратары райкомаў і старшыні райвыканкомаў; на вёсцы — старшыні сельсаветаў, дырэктары і начальнікі палітаддзелаў МТС і старшыні праўленьняў калгасаў.

Старшыня Савету Народных Камісараў СССР
В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Сакратар Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б)
І. СТАЛІН.

11 жніўня 1933 г.

Рашуча ўзьняць тэмпы і якасьць малацьбы

Арганізацыя абмалоту — ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗАДАЧА ЎБОРАЧНАЙ. Ад тэмпаў і якасьці абмалоту ў значнай меры залежаць тэмпы і якасьць збожжапаставак.

Мінулы год зьяўляецца павучальным урокам. Што ён паказаў? Малацьба была недапушчальна зацягнута. У цэлым радзе раёнаў яе адклалі да глыбокай восені. Да малатарні нярэдка прабіраўся клясавы вораг, замаскаваны шкоднік, злодзей, які рабіў сваю брудную справу. Раскрадваў ураджай і псаваў машыны, зацягваў абмалот і тым самым збожжадачу. ЗАЦЯГВАНЬНЕ АБМАЛОТУ — ПРАЯЎЛЕНЬНЕ КУЛАЦКАГА САБАТАЖУ.

ПОСЬПЕХ ЗБОЖЖАПАСТАВАК ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ЦЕСНАЙ, НЕАДРЫЎНАЙ ЗАЛЕЖНАСЬЦІ АД ТЭМПАЎ І ЯКАСЬЦІ МАЛАЦЬБЫ.

Іменна таму Саўнарком СССР і Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) яшчэ 24 мая падкрэсьлілі, што «... цэнтральнай задачай уборачнай кампаніі бягучага году зьяўляецца арганізацыя хутчэйшага абмалоту».

Іменна таму ліпеньскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б катэгарычна ўказалі, што ўвесь ураджай і, ва ўсякім выпадку, усё збожжа ў калгасах (і азімае і яравое), якое падлягае здачы дзяржаве, павінна быць абмалочана ў жніўні.

Аб чым сьвядчаюць першыя вынікі масавай уборкі?

Яны прымушаюць з усёй сілай сказаць, што цэлы рад раённых арганізацый ня ўлічыў петашкі урокаў. МЫ МАЕМ НЕДАПУШЧАЛЬНЫ, НЕБЯСЬПЕЧНЫ РАЗРЫЎ ПАМІЖ УБОРКАЙ І АБМАЛОТАМ.

Ліпеньскі пленум ЦК і ЦКК абавязаў трактарацэнтры, пад асабістую адказнасьць іх дырэктароў, падрыхтаваць да першага жніўня ўсе да адной малатарні. Да першага жніўня кожная малатарня павінна была быць адрамантавана і забясьпечана запаснымі часткамі, мець дакладны маршрут і г. д.

Але што зрабілі трактарацэнтры? Яны абмежаваліся фармальнымі бюракратычнымі запіскамі, а што робіцца на мясцох — для іх невядома.

З мясц ідуць сьвядчаньні аб шматлікіх прастоях трактарных малатарань, аварыях і г. д. Толькі зараз, у сярэдзіне жніўня, людзі ўбачылі, што гаручае не падвезена і адсюль — прастоі і малатарань і трактараў (Гомель), што няма пасаў і запасных частак (Рэчыца), што малатарні зусім не адрамантаваны (Чырвоная Слабада) і г. д. і г. д.

Партыя не пацерпіць гэтай дробнабуржуазнай распушчанасьці. Ні мінуты далейшай маруднасьці. Неадкладна выправіць недахопы ў рамонце, падвезьці гаручае і запчасткі, адным словам пусьціць кожную малатарню на максымальную скорасьць, каб ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ХУТЧЭЙШЫ АБМАЛОТ ЗБОЖЖА І ЗДАЧУ ЯГО ДЗЯРЖАВЕ — ВОСЬ У ЧЫМ ЗАДАЧА ДНЯ.

Пытаньне — у жывых людзях. ДА МАЛАТАРАНЬ — ЛЕПШЫХ ПРАВЕРАНЫХ УДАРНІКАЎ КАМУНІСТАЎ, КАМСАМОЛЬЦАЎ, ВЫПРАБАВАНЫХ КАЛГАСЬНІКАЎ.

Хіба ня ясна, што малейшае аслабленьне пільнасьці, малейшы самацёк разьвязваюць рукі ворагу, адкрываюць шчыліны для яго шкодніцтва?

Вазьмеце Танежыцкую МТС. Кулацкае ахвосьца імкнулася арганізаваць шкодніцтва, сварыі пры абмалоце, каб сарваць збожжапастаўкі.

У снопы перад абмалотам клалі каменьні (калгас імя Будзённага), у малатарні кідалі жалезныя вілы і проста кавалкі жалеза з мэтаю даўшыні (калгасы «Шлях Леніна» і «Чырвоны баец») і г. д.

Калі-б пільнасьць у гэтых калгасах была на вышыні, калі-б ахова малатарань была пастаўлена як належыць, шкодніцтва ворага было-б папярджана.

Або яшчэ адна красамоўная ілюстрацыя. У калгасе «Чырвоны пуцілавец» вылучаюць у якасьці начальніка малатарні яўнага подыра, разгільдзяя. Гэты, з дазволу сказаць, начальнік у самы разгар малацьбы адпускае людзей куды хто захоча і сам пакідае малатарню. Абмалот спыняецца. Машына застаецца бяз усякай аховы. Што гэта, як ня простае злачынства, як не адкрытае патураньне кулацкаму шкодніцтву?

ВЫШЭЙ ПІЛЬНАСЬЦЬ! МАЛАТАРНЮ—У НАДЗЕЙНЫЯ РУКІ.

Непаўна цярпець такіх злачынньнейшых фактаў, калі значная частка збожжа пры абмалоце застаецца ў саломе, ідзе ў сьмецьце і г. д.

А такіх фактаў ня мала. У калгасе «Камунар» (Чырвонная Слабада) у саломе пасьля абмалоту застаецца звыш 30 проц. збожжа.

У калгасе «Новае жыцьцё» (Тураў) малацьба праводзіцца настолькі нядбай на і бездказна, што значная частка збожжа таксама застаецца ў саломе.

Адназ з нашых важнейшых задач зьяўляецца АРГАНІЗАЦЫЯ МАЛАЦЬБЫ ПА АДНААСОБНЫХ ГАСПАДАРКАХ.

Бюро ЦК КП(б)Б зрабіла апошняе папярджаньне. Цэнтральны Камітэт яшчэ раз падкрэсьліў, што малейшае ігнараваньне адпаасобнага сэктару, малейшая недаацэнка працоўнага адпаасобніка — заўтрашняга калгасьніка, ёсьць апартунізм на практыцы, які льле ваду на млын клясавых ворагаў.

Вычарпальныя ўказаньні па дапамозе адпаасобнаму сэктару ў малацьбе даны ў пастановах ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК.

А як іх выконваюць пасобныя арганізацыі? Замест масавай работы—голае адміністраваньне, шкоднейшае «лявацкае» захапленьне загадам. Замест падрыхтоўкі пунктаў па абмалоту — самацёк, бязьдзейнасьць, часамі простае адмаўленьне ад дапамогі адпаасобніку ў малацьбе.

Вазьмеце БАБРУЙСК. Амаль ні ў адным сельсавеце пункты па абмалоту не адкрыты.

У Старцаўскім сельсавеце, напрыклад, ні адзін пункт яшчэ не працуе. Кіраўнікі сельсавету адкрыта сабатуюць арганізацыю малацьбы па адпаасобных гаспадарках.

На просьбы адпаасобнікаў дзецца адзін стэрэатыпны адказ:

— Малатарні яшчэ не адрамантаваны.

У Туркаўскім сельсавеце калгасы, маючы поўную магчымасьць арганізаваць пункт па абмалоту на складаных малатарнях, яшчэ і цяпер не прыступілі да гэтай справы.

Трэба рашуча і неадкладна пакончыць з ігнараваньнем працоўнага адпаасобніка.

Упічыць усе малатарні — і конныя і ручныя — забясьпечыць іх максымальную нагрузку, арганізаваць абмалот па дзесяцідворках — вось у чым задача. ДЗЕСЯЦІДВОРКА — АСНОЎНАЕ ЗЬВЯНО Ў МАСАВАЙ І АРГАНІЗАТАРСКАЙ РАБОЦЕ СЯРОД ПРАЦОЎНЫХ АДНААСОБНІКАЎ.

Трэба забясьпечыць неадкладнае разгортваньне работы пунктаў па абмалоту пры сельсаветах і калгасах, дзе-б працоўны адпаасобнік мог абмалаціць збожжа за невялікую плату.

І, нарэшце, НІЯКАЙ НЕДААЦЭНКІ РУЧНОЙ МАЛАЦЬБЫ (ЦАПАМІ). Там, дзе малатарань мала, неабходна неадкладна арганізаваць малацьбу цапамі.

У нас ня рэдка забываюць, ігнаруюць адну з важнейшых задач — правільную выдачу авансаў і папярэдні плян разьмеркаваньня калгасных даходаў пасьля выкананьня абавязацельстваў перад дзяржавай і ссыпкі адпаведных фондаў. А гэта-ж магутны рухавік і тэмпаў і якасьці абмалоту.

Рэзка выяўляюцца дзьве тэндэнцыі.

Першая заключаецца ў патураньні, у гнілым лібэралізьме да кулацка-спажывецкіх месьніцкіх настрояў. У Клімавіцкім, Бягомльскім, Ельскім і іншых раёнах многія калгасы ўвесь першы абмалот пусьцілі на авансы, ня здаўшы дзяржаве ніводнага кілё. Такая практыка — кулацкая практыка і яна мае на мэце зацягнуць збожжапастаўкі.

Другая тэндэнцыя заключаецца ў патураньні кулацкай ураўнілаўцы. У радзе раёнаў авансы выдаюцца не па працаднёх, не па колькасьці і якасьці працы, а па кулацкім ядоцкім прынцыпе. Замест авансаў па працаднёх выдаюцца падушныя пайкі, замест збожжа — печаны хлеб і г. д.

У калгасе «Чырвоны пуцілавец» калгасьнік ПАРХАМОВІЧ выпрацаваў 241 працадзень, а калгасьнік Лапацінскі — 121. Першы пры выдачы авансаў атрымаў 8 пгр. збожжа, а другі — 10.

Такая кулацкая практыка вядзе да развалу працоўнай дысцыпліны і пагражае свайчасовай уборцы.

Авансы павінны выдавацца толькі па колькасьці і якасьці працы, у цеснай залежнасьці ад працадзён.

Знаходзяцца і такія «левакі», якія адкладваюць выдачу авансаў да поўнага выкананьня ўсіх паставак.

Каму гэта на руку, як не кулаку. Партыйныя арганізацыі павінны забясьпечыць безагаворачнае і правільнае выкананьне пастаноў ЦК аб выдачы авансаў. Трэба, каб кожны калгасьнік ведаў, што яму дасьць сумленная праца ў калгасе, як выглядае яго працадзень.

ПА-БАЛЬШАВІЦКУ АРГАНІЗУЕМ АБМАЛОТ, РАШУЧА ЎЗЬНІМЕМ І ТЭМПЫ І ЯКАСЬЦЬ МАЛАЦЬБЫ. АБМАЛОЧАНАЕ ЗБОЖЖА ПРОСТА З-ПАД МАЛАТАРНІ — НА ПРЫЁМАЧНЫ ПУНКТ.

БССР

убрана ўсіх збожжавых культур

38 проц.

у тым ліку жыта **74,6** проц.

Зах. вобласьць

убрана ўсіх збожжавых культур

45,3 проц.

Жнівеньскі плян збожжаздачы перавыканан

ЦК КП(б)Б—т. Гікало, Саўнарком—т. Галадзеду

ГОМЕЛЬ.

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ЦК КП(б)Б, НА АСНОВЕ АРГАНІЗАЦЫІ МАС КАЛГАСЬНІКАЎ І ПЕРАДАВЫХ АДНААСОБНІКАЎ, ГОМЕЛЬШЧЫНА ПЕРАВЫКАНАЛА НА 12 ЖНІЎНЯ ЖНІВЕНЬСКІ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗДАЧЫ. МАЮЧЫ ЗАДАНЬНЕ Ў 3.700 ЦЭНТН., РАЁН ЗДАЎ 4.150 ЦЭНТН. ПРАЦЯГВАЕМ БАРАЦЬБУ ЗА ЯКАСЬЦЬ УБОРКІ І ДАТЭРМІНОВУЮ ЗДАЧУ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ.

ГАРКОМ — ШАФАРЭНКА.
ГАРСАВЕТ — РАЧЫЦКІ.

З ФРОНТУ БАРАЦЬБЫ ЗА ПЯРШЫНСТВА ВА УБОРЦЫ І ПАСТАУКАХ

(Па тэлеграфу, тэлефону ад райкомаў, палітаддзелаў, нашых карэспандэнтаў і Белта

БЕШАНКОВІЧЫ

Плян севазагатовак у 10.000 цэнтнэраў 13 жніўня выканан на 100 проц. Усяго здана 10.074 цэнтн.

Райком — Каждан, райвыканком — Шах, Упаўкамзаг — Фальковіч.

ШКЛОЎ

Калгас «Шлях Леніна», Касяніцкага сельсавету, першым у раёне здаў дзяржаве 645 кгр. ільняного семя.

Плян здачы жыта калгасам выканан поўнасьцю.

ЛЮБАНЬ

Калгас «Чырвоны земляроб» першым у раёне распачаў сяўбу азімага жыта. 12 жніўня засеяна 7 га. Зямля для далейшай сяўбы падрыхтавана. Сеем высакякасным насеньнем.

Зайцаў.

МЕНСК

Калгас імя Войкава падрыхтаваў першыя 54 га пад радковую сяўбу азімых. Вывозім гной пад пшаніцу на 27 га.

ШКЛОЎ

Нездавальняюча ідзе ўборка па Чарнянскім і Чорнаруцкім сельсаветах, Шклоўскага раёну. Калгас імя Карла Маркса толькі 5 жніўня распачаў жніво жыта. Дрэнна пастаўлена працоўная дысцыпліна. З агульнай колькасьці 34 2-га жніўня ня выйшлі на работу 23 жанчыны. 6-га жніўня ня выйшла на работу 18 жанчын. Гэта вельмі ўплывае на разрыў паміж вязкай жыта і работай жнівярак. 5 жніўня на полі нанач засталося нязьвязаных два гэктары жыта.

У калгасе «Чырвоная зорка» ня ўбрана 15 га сенажаці. Тры жнівяркі, якія ёсьць у калгасе, выкарыстоўваюцца вельмі дрэнна і працуюць толькі ў адну зьмену. Замест нормы ў 4 га яны даюць ня больш 2.

Тое самае ў калгасе «Новы строй» і «Калгасная праца».

Уліку конных малатарань у сельсаветах няма.

Дрэнна працуе партыйная ячэйка Чарнянскага сельсавету, якая не расставіла камуністаў і не прымацавала да пасобных вучасткаў і калгасаў.

Ні адзін калгас не бярэцца за ўборку ільну з прычыны таго, што ў гэтых калгасах засеян селекцыйны лён і калгасы чакаюць пакуль аграномы скажуць убрадь яго, а аграномы таксама не сьпяшаюцца.

Б. Д.

ВУЗДА

Першым у Вузьдзенскім раёне скончыў уборку сена і азімых калгас «Будаўнік». Жыта скончылі жаць 5-га жніўня, а 10-га жніўня калгас цалкам выказаў свой абавязак перад дзяржавай, адаўшы з першага абмалоту 63,8 цэнтн. жыта, т. ч. усе 100 проц.

Трактар, працуючы ў дзень на малатарні, уночы працуе на полі. За дзьве ночы ўзарана 4 га пад жыта.

В. Казлоўскі.

Ход збожжапаставак па БССР

на 10 жніўня г. г. (у тонах)

Плян	Выканана	Проц.	Было па 5-VIII
229.753	3.695	2,5	0,7

По сэктарох	Паступіла ва другую пяцідзеўку жніўня	Проц. выкананьня гадав. пляну
Калгасы, якія абсл. МТС	795	3,9
„ „ не абсл. МТС	1.933	4,7
Адпаасобнікі	1.886	1,5
Кулакі	52	0,5

Плян па натураплаце МТС выканан на 0,2 проц. Па насеннфонду плян выканан на 0,3 проц.

ЗВОДКА

аб ходзе ўборкі азімых і яравых па БССР на 10 жніўня 1933 году (у гэктарах)

№ № па пар.	РАЁН	Зжата азімых: Усяго: Плян	Проц. выкананьня	У тым ліку у проц.: Саўгасы	Калгасы	Адпаасобнікі	У проц. да зжатага: Зьвезена	Абмалочана азімых	Зжата яравых: Усяго: Плян	Проц. выкананьня	У тым ліку ў проц.: Саўгасы	Калгасы	Адпаасобнікі
	ПАЎНОЧНАЯ ЗОНА												
1.	Вушацкі	15.537	100,0	—	100,0	100,0	26,0	1,3	17.386	1,1	—	1,3	0,6
2.	Дубровенскі	13.556	88,1	57,3	92,0	85,1	5,0	2,2	16.608	1,1	—	1,8	—
3.	Полацкі	19.192	86,5	13,9	95,0	77,6	28,5	4,0	25.623	—	—	—	—
4.	Дрысенскі	11.707	83,6	—	93,9	68,6	27,2	8,1	16.597	1,2	—	1,6	0,4
5.	Аршанскі	26.390	77,2	53,9	92,6	51,5	15,8	5,4	35.088	3,5	0,6	3,6	3,8
6.	Расонскі	11.836	73,4	—	88,4	66,5	29,6	6,6	13.590	0,4	—	0,6	0,2
7.	Лепельскі	17.097	72,4	—	70,5	80,3	27,0	3,8	18.529	2,3	—	2,2	3,3
8.	Віцебскі	11.313	72,2	46,8	77,0	65,7	12,1	3,2	20.587	7,2	3,9	9,1	4,5
9.	Бешанковіцкі	13.808	68,6	—	70,1	66,9	28,0	7,1	20.681	1,6	—	1,8	1,5
10.	Лёзьнянскі	14.824	68,3	—	80,2	34,8	14,3	9,6	22.689	5,4	—	4,1	12,0
11.	Сіроцінскі	12.980	64,9	—	79,4	55,4	25,5	8,4	16.291	3,9	—	4,8	2,9
12.	Асьвейскі	5.525	57,6	12,5	66,4	51,2	27,1	4,5	8.504	0,3	—	0,5	—
13.	Сеньненскі	17.582	57,1	—	73,0	30,7	11,2	—	20.004	2,4	—	3,0	—
14.	Гарадоцкі	24.245	55,6	—	69,6	46,2	19,0	3,7	30.324	0,4	—	0,4	0,4
15.	Сураскі	10.357	54,1	87,5	59,1	50,8	23,7	2,0	13.651	—	—	—	—
16.	Чашніцкі	13.617	53,7	—	78,2	31,8	20,1	3,5	12.733	1,0	—	1,4	0,1
	Разам па зоне:	239.560	71,4	50,0	81,7	59,4	20,9	4,4	308.885	2,2	0,9	2,5	1,6
	ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗОНА												
1.	Барысаўскі	19.152	100,2	45,5	98,6	103,0	67,5	6,5	22.836	17,1	—	19,4	17,4
2.	Крычаўскі	9.080	100,0	—	—	77,7	50,3	10,0	11.325	13,0	—	20,7	—
3.	Менскі	17.560	97,4	—	101,7	81,7	21,6	—	22.737	7,0	2,5	9,0	3,4
4.	Пухавіцкі	25.778	94,8	76,2	90,3	96,9	25,6	2,4	26.163	17,8	2,4	10,8	24,4
5.	Быхаўскі	24.227	89,1	59,4	—	83,3	69,9	12,9	30.951	—	—	—	—
6.	Бярэзінскі	17.947	86,9	19,0	90,0	85,9	77,4	5,3	21.631	10,7	2,6	9,7	11,5
7.	Вузьдзенскі	10.750	86,1	—	—	75,3	41,6	4,7	12.163	3,9	—	3,6	4,8
8.	Чэрвеньскі	17.555	83,9	10,7	74,1	88,8	75,5	—	16.974	12,9	—	12,4	15,1
9.	Магілёўскі	24.171	76,9	69,2	95,4	67,1	38,1	10,1	36.120	—	—	—	—
10.	Талачынскі	21.734	76,8	—	—	56,1	5,1	5,1	24.638	14,3	—	23,8	2,8
11.	Смалявіцкі	16.115	76,6	43,4	88,7	70,9	16,6	1,6	19.631	5,1	3,1	3,7	6,6
12.	Чэрыкаўскі	13.973	75,4	—	96,7	32,7	36,0	9,1	17.903	10,8	—	11,6	8,8
13.	Крупскі	17.993	75,2	—	76,1	74,3	37,2	4,3	19.561	4,8	—	4,5	5,4
14.	Капыльскі	20.938	79,9	49,2	85,1	75,3	65,7	4,8	20.049	18,4	10,5	14,4	28,0
15.	Клічаўскі	14.535	73,5	—	68,4	79,2	36,4	6,6	13.480	—	—	—	—
16.	Дзяржынскі	14.302	72,1	62,5	80,1	40,5	12,5	9,9	20.595	3,9	—	4,1	4,0
17.	Заслаўскі	11.219	69,7	—	84,8	39,3	8,1	—	13.141	3,3	—	3,8	2,4
18.	Шклоўскі	23.589	66,0	91,8	66,7	65,1	13,1	3,1	31.789	4,1	18,6	3,2	4,1
19.	Бялыніцкі	17.306	64,7	—	60,1	69,4	59,6	12,7	18.068	20,2	—	17,5	23,1
20.	Клімавіцкі	20.211	64,3	—	59,2	90,5	48,0	7,8	26.456	14,7	—	17,4	2,7
21.	Мсьціслаўскі	22.059	62,2	77,5	70,0	41,3	16,9	6,4	23.307	4,0	2,4	4,0	4,5
22.	Асіпавіцкі	10.883	59,0	98,7	73,2	51,9	33,5	5,1	13.220	16,9	8,2	16,7	17,5
23.	Касьцюковіцкі	25.850	56,8	40,6	65,0	38,0	42,4	12,3	30.285	29,4	19,9	32,9	20,8
24.	Горацкі	23.423	53,8	38,1	61,6	45,5	35,3	9,7	29.444	4,4	—	4,9	4,1
25.	Плешчаніцкі	11.991	52,4	—	56,1	59,5	18,5	1,2	12.917	6,1	—	6,1	6,7
26.	Бягомльскі	11.594	50,9	—	63,2	31,4	27,9	5,7	12.290	6,2	—	6,1	7,1
27.	Прапойскі	14.368	48,1	—	63,2	39,2	58,8	17,3	16.118	15,0	—	15,9	14,3
28.	Чаўскі	25.031	47,3	—	62,0	39,8	34,4	11,3	33.582	17,1	—	17,0	17,6
29.	Лагойскі	13.895	45,4	—	54,3	35,8	13,2	—	14.169	1,7	—	1,1	2,7
	Разам па зоне:	517.229	72,1	71,9	77,7	66,8	39,3	6,3	611.543	10,0	2,4	10,8	9,6
	ПАЎДНЁВАЯ ЗОНА												
1.	Жлобінскі	19.662	100,0	68,4	—	100,0	65,5	11,6	20.784	8,9	—	20,3	8,4
2.	Глускі	17.442	100,0	43,8	—	95,6	44,2	3,5	21.859	1,1	—	2,2	—
3.	Камарынскі	5.643	100,0	100,0	—	86,8	88,9	16,3	6.009	18,7	73,9	25,0	—
4.	Мазырскі	25.387	99,4	73,4	—	94,6	75,0	10,9	23.447	—	—	—	—
5.	Старобінскі	12.742	97,2	—	107,6	89,3	67,9	6,8	11.519	13,4	—	8,0	19,0
6.	Лельчыцкі	9.500	96,5	89,2	95,4	96,4	77,3	17,5	10.639	9,1	0,9	11,8	8,5
7.	Веткаўскі	21.961	92,6	—	90,2	90,9	65,4	13,7	16.374	—	—	—	—
8.	Церахаўскі	21.300	91,6	—	91,9	91,1	66,9	3,7	19.771	11,7	15,1	17,5	6,5
9.	Гомельскі	8.302	90,8	87,6	96,1	88,5	83,7	16,5	11.855	22,7	5,2	27,3	26,2
10.	Пятрыкоўскі	15.253	90,2	76,6	94,8	89,0	98,6	—	17.937	15,2	1,2	18,4	15,3
11.	Кармянскі	15.796	88,1	—	85,7	89,5	100,0	4,7	20.263	27,1	—	25,7	30,6
12.	Лоеўскі	10.467	85,0	100,0	96,3	73,6	79,1	20,8	12.181	23,1	9,3	23,1	24,3
13.	Брагінскі	11.942	84,0	—	92,6	91,1	57,3	12,1	9.567	34,4	23,5	34,2	35,5
14.	Чырвона-Слабодзкі	10.293	83,4	90,3	94,9	76,7	68,9	7,7	8.017	9,5	17,4	7,9	10,8
15.	Хойніцкі	11.695	82,4	—	71,8	96,2	96,1	15,2	11.117	32,3	20,6	34,8	30,8
16.	Любаньскі	10.420	81,9	86,3	97,4	73,6	70,9	9,4	11.406	23,7	7,9	28,6	21,6
17.	Жыткавіцкі	5.950	81,0	—	80,0	79,4	4,1	4,1	7.195	26,9	7,2	45,0	10,7
18.	Уваравіцкі	14.429	80,3	—	99,7	73,4	71,9	19,0	14.503	18,2	—	19,4	17,6
19.	Рэчыцкі	20.501	79,8	88,3	79,3	79,8	81,0	5,4	19.721	11,1	9,3	9,2	14,1
20.	Слуцкі	22.418	77,3	—	89,8	61,3	41,3	5,9	21.291	13,0	1,8	15,0	10,3
21.	Парыцкі	18.895	75,4	11,3	84,7	78,4

Партыйнае будаўніцтва

ПЕРАБУДОВАЙ ПАРТРАБОТЫ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ НЕАДКЛАДНАЕ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ПАСТАНОЎ ЦК і СНК АБ ТРАНСПАРЦЕ

ВОПЫТ РАБОТЫ ПАРТГРУПОРГА ТАВ. ПРАЛІЧА

МЕНСК.

У ближэйшыя дні пачнецца чыстка партыйнай арганізацыі **Менскага вагона-рамонтнага дэпо.**

Як-жа камуністы гэтага адказнейшага вучастку работы чытуначнага транспарту рыхтуюцца да чысткі партыі, як яны ў сваёй штодзённай вытворчай рабоце ажыццяўляюць апошнія пастановы СНК і ЦК партыі?

Яшчэ ня так даўно вагонае дэпо знаходзілася ў глыбокім прарыве. Люты і сакавік—месяцы паўнейшага развалу вытворчай работы: вялізарныя сумы перавыдаткаў, частыя затрымкі пасажырскіх і таварных цягнікоў з-за несваячасовага рамонту вагонаў, вялізарная колькасць адчэпак вагонаў з-за гарэньня буксаў і г. д. Прычына заключалася ў тым, што была расхлябанасьць, разгільдзяйства, на якія не зварачалі ўвагі ні партыйная, ні гаспадарчая арганізацыі.

Зараз, у выніку работы праведзенай партыйным калектывам па падрыў тоўцы да чысткі партыі і практычнай рэалізацыі пастановы СНК і ЦК партыі аб транспарце ў вытворчай рабоце ёсьць зрух, але ён невыстарчальны. Так, калі ў чэрвені месяцы пры норме 10 вагонаў заводзкага рамонту адрамантавана 11 вагонаў, дык у ліпені гэта лічба ўзрасла да 19 вагонаў. Па бягучым рамонце пасажырскіх вагонаў, пры норме 70 адзінак у месяц, выкананa: у чэрвені 77, а ў ліпені 84 вагоны. Такім чынам з выкананьнем пляну па рамонту вагонаў становішча ня дрэннае. Але яшчэ далёка ня добра са сьледжаньнем у дарозе і аглядам вагонаў. Ня гнездзіны на тое, што ў параўнаньні з чэрвенем, калі было 16 адчэпак, у ліпені такіх выпадкаў стала значна менш — 10 адчэпак. З-за гарэньня буксаў усё-ж па гэтым вучастку становішча надзвычай пагражаючае. Тут партыйны калектыў яшчэ мала чаго зрабіў і партыйная работа тут зьяўляецца адным з адсталых вучасткаў. Аб гэтым ясна сьведчыць работа Менскага абменнага пункту, дзе п'янства, прагулы, расхлябанасьць ёсьць і на сёньняшні дзень.

Некалькі дзён таму назад партыйны калектыў на пасяджэньні бюро выносіць дэкларацыйную пастанову, у якой указвае на агіднае становішча работы абменнага пункту і прапануе партыйнай ячэйцы «разгарнуць партыйна-масавую работу». Канкрэтнага нічога ня прынята і парт'ячэйка абменнага пункту не працуе. Тут каму чысты ня рыхтуюцца да чысткі, ня выкошваюць пастановы СНК і ЦК партыі аб рабоце транспарту.

11 жніўня чатыры чалавекі з брыгады дзённай зьмены тав. **Канасэвіча**, працуючы на бягучым рамонце з адчэпкамі, прагульваюць дзьве гадзіны. 12 жніўня ў зьмене камуніста **Фрыдрыха**, заступчыкі **Жэўнык** і **Паўловіч**, папраўляючы цыстэрну са сьпіртам, дастаюць з яе сьпірт і тут-жа, на рабоце п'янствуюць. Брыгадзір ня зьнімае іх з работы, не паведамляе аб гэтым вышэйшым адміністрацыйным органам, яны працуюць п'янымі.

І гэта грубае парушэньне працоўнай дысцыпліны застаецца беспакараным, парт'ячэйка не стварае вакол гэтых п'яниц і гультаёў грамадзкай думкі, ня прыцягвае да партыйнай адказнасьці камуніста-майстра абменнага пункту, які ня прымяняе да людзяў дысцыплінарнага статуту.

Але чым-жа займаецца партыйная ячэйка, як яна наладжвае партыйную работу, калі пытаньні перабудовы вытворчай работы зышлі з парадку дня? У часьці паасобных брыгадах, якія працуюць на розных зьменах, партарганізатары не зьяўляюцца сапраўднымі балшавікамі, не вядуць барацьбы з парушальнікамі працоўнай дысцыпліны. У першай зьмене партарганізатарам вылучан член партыі тав. **Левановіч**, якому даручылі некалькі паравагрузак; ён рэдактар насьценгазэты, ён-жа сьпімальны пост і парторг, а побач з ім працуе моцны камуніст, стары вытворчы работнік тав. **Горагун**, які на працягу году ня мае ніякай паравагрузкі. У рэзультаце такога разьмеркаваньня парт нагрузак не працуе ні тав. Левановіч, ні тав. Горагун. Парт'ячэйка не заслухоўвае справаздач партарганізатараў, ня кіруе іх работай.

Такое становішча ў рабоце парт'ячэйкі абменнага пункту ёсьць рэзультат таго, што кіраўніцтва партыйнага калектыву адарвалася ад вытворчасьці, прадаставіла партработу самацёку і занялося складаньнем рэзалюцый.

Між тым, у паасобных камуністаў дэпо ёсьць добрыя ўзоры партыйна-масавай работы, на якіх трэба было б навучыцца многім партыйным ячэйкам вагоннага дэпо. Як трэба працаваць групапартарганізатару і партарганізатару служыць прыкладам партыйная работа групапартарганізатара ущіль цэху тав. **Праліча**. У рэзультаце ўмелай пастаноўкі партыйна-масавай работы на ущільцэху, ён у ліпені месяцы даў эканоміі 6.570 руб., прамфінплян выканаў на 196 проц., дэталямі забясьпечаны ўсе цэхі вагоннага дэпо.

Як-жа партгрупа дасягнула такіх рэзультатаў?

Партгрупа ў складзе 7 камуністаў дэтальна распрацавала на сваёй нарадзе пастанову СНК і ЦК партыі аб рабоце транспарту і ўзяла на сябе канкрэтныя абавязацельствы. Камуністы інструмэнтальнай кладовай на асновe сацыялістычнага спаборніцтва, на чале з тав. Пралічам, бяруць на сябе абавязацельства да 1 жніўня паправіць увесь ня спраўны інструмэнт. Камуністы інструмэнтальнай кладовай на чале з тав. **Любічам** прыводзяць ва ўзорны парадак кладовую, кожны болцік, гайка мае сваё месца і знаходзіцца па вопісі. Камуністы куўні скары стоўваюць кожны кавалак жалеза. Злучальныя галоўкі тармазных рукавоў, якія валяюцца на шляхох, зьбіраюцца, у куўні апальваюцца і гэта дэфіцытная дэталь поўнасьцю задавальвае патрэбнасьць вагоннага дэпо, скарачаючы кошт дэталі на 50 проц. Так камуністы змагаюцца за вытворчыя паказальнікі.

Партгрупа сыстэматычна зьбіраецца і прапрацоўвае пастановы партыі, а пасьля кожны камуніст на вытворчасьці растлумачвае гэтыя пастановы сярод беспартыйных. На кожнага камуніста ўскладзены абавязак — павышаць сваю тэхнічную і палітычную пісьменнасьць. Кожны дзень 45 мінут камуністы і многія беспартыйныя вучацца тут-жа, у цэху ў тэхгуртку і палітгуртку.

Камуністы партгрупы тав. Праліча даюць самы рэзкі адпор парушальнікам працоўнай дысцыпліны. Здарылася так, што камуніст **Навіцкі** ў чэрвені прышоў на работу выпіўшы. Праліч зараз-жа склікае партгрупу, дзе апытыпартыйны пастанак Навіцкага атрымлівае самую рэзкую ацэнку.

Сур'ёзным падхопам партгрупы Праліча зьяўляецца адсутнасьць улікy работы, няма дзеньніка. Слаба кіруе партгрупай парт'ячэйка, сыстэматычна ня зьбірае і не дае ім напрамку ў рабоце.

Застаўся лічаныя дні да пачатку чысткі партыі ў вагонным дэпо. Партыйны калектыў павінен скарыстаць вопыт партгрупорга тав. Праліча для таго, каб да пачатку чысткі разгарнуць партыйна-масавую работу ва ўсіх цэхах, у зьменах, практычна ажыцьцяўляючы пастанову партыі аб рабоце транспарту.

Падараўскі.

КАЛІ-Ж, НАРЭШЦЕ, СКОНЧЫЦЦА „ПУСКАВЫ ПЭРЫЯД"?

Калі паглядзець на вялізарныя карпусы віганту першай пяцігодкі—**Гомсель машу**, цэхі якога абсталяваны паводле навейшай тэхнікі, дык нельга і падумаць, каб такое прадпрыемства магло адтэгаваць у выкананьні вытворчай праграмы.

Аднак, гэта так. Дамо слова лічбам. Прамфінплян у 1932 годзе быў выкананы усяго на 65 проц., у першым паўгодзьдзі бягучага году на 79,4 проц. Сабекошт прадукцыі зьнізіўся на 31,2 проц. (супроць пляну — 37 проц.). Брак па ліцьцю складае 9,7 проц. (супроц.—8 проц. плянавых). Страты, з прычыны браку за 5 месяцаў складаюць — 80 тыс. руб. Ліпеньскі плян таксама недавыкананы (91,4 проц.), пры чым брак па ліцьцю павялічыўся да 12,4 проц.

У чым справа? Чаму Гомсельмаш, маючы усе магчымасьці для пасьпяхова га выкананьня праграмы, знаходзіцца ў прарыве? Калі гэтыя пытаньні паставіць перад дырэктарам заводу тав. **Гэнкіным**, то ён адразу адкажа: **«Што вы хочаце, завод новы, мы-ж асвойваем тэхніку».**

Бясспрэчна, асваеньне тэхнікі — задача вялізная. Гэта падкрэсьліў і студзеньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б). Але гэта не азначае, што асваеньне новага абсталяваньня паміма цягнуцца дзесяткі год. А на Гомсельмашы імецца так справа і абстаіць. Асваеньне тэхнікі і новых відаў прадукцыі ідзе над звычай марудна. Пакажам гэта на прыкладзе вырабу сіласарэзкі «Інтэрнацыянал» з прыстасаваньнем **Тартышнікава.**

У 1932 годзе завод выпушчаў сіласарэзку «Інтэрнацыянал», якая ўжывалася толькі для рэзкі зялёнага сіласа. Машына мела вельмі абмяжованыя тэрміны свайго ўжываньня. Рост сацыялістычнай сельскай гаспадаркі прад'явіў да канструктарска-навуковай мысьлі, а таксама да заводаў Сельгасмашынпрага будаўніцтва запатрабаваньне — даць такую машыну, якая-б магла пераапрацоўваць сурагаты. Канструктар тав. **Тартышнікаў** удала вырашыў гэту праблему. Сіласарэзку «Інтэрнацыянал» ён пераўзброіў, дадаў да яе новыя дэталі і гэтым самым ператварыў у магутную — універсалку, якая можа ўжывацца ва ўсіх аддалёных мясцовасьцях Саюзу, пачынаючы ад Крыму і канчаючы тундрай. Машына ня толькі рэжа, але і дробіць у аднародную муку кукурузу з качанамі, гальлём, жмыхай.

Першыя дзьве машыны, выробленыя Гомсельмашам, на іспытах паказалі высокую якасьць. Камісія іх прыняла. Цэнтрасельмаш даў заданьне заводу на працягу чэрвеня правесьці падрыхтоўку, каб з першага ліпеня поўнасьцю прысту піць да масавага вырабу машын з пры стасаваньнем Тартышнікава.

Тэрмін невялікі. Але, калі-б за гэту работу адділы вытворчасьці (адказны **Левін**) і канструктарскі (адказны **Караўскі**) па-баявому узяліся, можна было ку ды лепш падрыхтавацца, чым яны ў сапраўднасьці падрыхтаваліся.

Што-ж патрабавалася ад гэтых адділаў? Чарцяжы для дэталяў былі прысланы. Трэба было толькі падрыхтаваць чарцяжы (эскізы) для таго, каб па іх зрабіць штампы і кандуктары, неабходныя для масавага вырабу новых дэталяў.

Гэтыя адділы паказалі такія тэмпы, якія ўласьцівы толькі чарапасе. 20 дзён пайшло толькі на падрыхтоўку чарцяжоў... чарцяжоў, а не саміх штампаў і кандуктараў! **Караўскі** (начальнік канструктарскага адділу) ўвесь час разважаў прыкладна так: **«Чаго нам сьпяшацца завод выпускае машыну «Інтэрнацыянал», ну, а калі мы чарцяжы дамо ў канцы ліпеня — бяды вялікай ня будзе. Тэмпы... ды гэта толькі агітацыя, патрэбна ўвага і час і ўсё будзе зроблена».** Не сьпяшаўся і загадчык адділу вытворчасьці Левін. Ён увесь час спасылаўся на канструктарскі адділ. **«Я косьвенна залежу ад Караўскага,—заяўляў Левін. Чарцяжоў няма — значыць нельга рабіць штампаў і кандуктароў».**

Так разважалі людзі, седзячы ў кабінэтах, часта наглядаючы на гадзіньнік, і калі стрэлка падыходзіла да чатырох —хутка брадзі «панку ў ахапку» і «бывайце здаровы»! сьпяшаліся да хаты...

Цэнтрасельмаш у канцы чэрвеня малі**ра**ваў: **«з першага ліпеня прыступайце да выпуску машыны канструкцыі Тартышнікава. Ніводнай машыны старой канструкцыі трэст ня прыме».** У цэхі палецеў загад дырэктара: **«Неадкладна прыступіць да вырабу новых машын».**

— Давайце штампы, кандуктары! Ня ма чым працаваць! — бегаў з крыкам у вытворчы адділ начальнікі цэхаў.

Але штампаў і кандуктароў ня было. **«Заўтра спусьцім чарцяжы»** — абяцалі Караўскі і Левін. Чарцяжы чарціліся... дэталяй-жа штампаваць і сьверліць ня было на чым. Прыплося прыступіць да вырабу дэталяй на «вока». Выраблялі, і напалову выкідвалі ў брак. Дэталі не падыходзілі — іх падганялі, падпільвалі, падрубвалі... зьбіралі машыны, а калі падавалі іх на іспытную станцыю, яны аказваліся нягоднымі.

Машына з прыстасаваньнем Тартышнікава патрабавала дакладных стандартных і добраякасных дэталяй. Шмат было бегатні, крыку ў аборачным цэху... На канвэеры стваралася пробка... дэталі браківаліся.

— Дайце штампы, кандуктары — патрабавалі лёгка-кацельны і зборачны цэхі.

Але гэта быў «голас вапіючага ў пустыні». Канструктарскі і вытворчы адділы толькі ў ліпені і то з вялікай натужкай сталі спускаць у цэхі чарцяжы. Аднак і пасьля даўгі чарцяжоў справа не атрымала належнага зруху. Выпрацаваны па чарцяжу штамп для вырабу дэталі Т-101 аказаўся нягодным: — дрэнна быў скансструяван канструктарам **Рогавым.** Такі-ж самы лёс напаткаў і штампы для дэталяй **Т-100, Т-44.** Там, дзе патрэбна было паставіць сталь — паставілі жалеза...

Адсутнасьць штампаў прымусіла лёгка-кацельны цэх 80 проц. работы на дэталях да новай машыны вытвараць уручную. Дэталі ня мелі дакладных разьмераў і стандартаў. Пры аборцы машыны прыходзілася рабіць падгінаўку дэталяй, што адбівалася на тэмпах і асабліва на якасьці работы.

Трэба адзначыць, што з першых-жа дзён у зборачным цэху забілі трывогу. Але тэхнічны дырэктар **Міхайлоўскі** на гэта махнуў рукой.

— Пагадзіце, не сьпяшайцеся,—гаварыў ён.—Дайце людзям час — і ўсё будзе зроблена.

Час ішоў, а справа ня рухалася з месца. Дэталі пачкамі выкідваліся ў брак. Зборка машын затрымлівалася. Бюро ГТС заводу паразьмі ліквідаваць прарыў. Яно абвясьціла суботнік усіх ІТР па выяўленьні і выпраўленьні дэфектаў. 23 чалавекі пасьля работы накіраваліся ў цэхі. Здавалася, што ўсё будзе зроблена. Гомсельмаш нарэшце пачне выпускаць добраякасныя машыны. Аднак, на справе атрымалася другое. Людзі пахадзілі, паглядзелі і разышліся. А дэталі па-ранейшаму выпускаліся з вялікімі дэфектамі, машыны бракаваліся.

Такім чынам, ліпеньскае заданьне па выпуску сіласарэзкі з прыстасаваньнем Тартышнікава сарвана. Аб чым гэта сьведчыць? **Перш за ўсё аб саноўнабарскіх адносінах дырэктара заводу Гэнкіна, тах. дырэктара Міхайлоўскага і раду адказных інжынэрна-тэхнічных работнікаў (Караўскага, Іоффэ, Любоцкага, Левіна, Рогава), якія сабатавалі хуткае асваеньне новай машыны, не зь бясьпечылі своечасовага і добраякаснага вырабу штампаў і кандуктараў.**

Прарыў у першым месяцы 3-га кварталу сьведчыць яшчэ і аб тым, што кіраўніцтва Гомсельмашу не перабудавала сваёй работы ў адпаведнасьці з пастановамі апошніх пленумаў ЦК і ЦКК і Гомельскага ГК і ГарКК КП(б)В аб рабоце прамысловасьці.

Матэрыям, палівам, і іншым сырцом Гомсельмаш забясьпечан поўнасьцю. Ніякіх аб'ектыўных прычын зяма. Дакуль-жа завод будзе асвойваць новую тэхніку? Калі, нарэшце, кіраўнікі заводу перастануць спасылацца на «пускавы пэрыяд»? Ніякіх апраўданьняў! Партыя і ўрад ня могуць надалей цярпець адставаньня магутнага гіганту прамысловасьці! Усе арганізацыі Гомсельмашу павінны па-бальшавіцку ўзяцца за ліквідацыю ганебнага адставаньня, мабілізаваць усіх рабочых на барацьбу за тэмпы і якасьць!

Стырэц.

ГОМЕЛЬСКІ АБМЕННЫ ПУНКТ ПРАЦУЕ ПА СТАРЫНЦЫ

У рабоце чыгуначнага транспарту наступіў самы адказны пэрыяд. З саўгасаў, калгасаў і вёсак у пралетарскія цэнтры рушацца чырвоныя абозы з прадукцыяй новага ўраджаю. З гарадоў ідуць машыны ў вёску. Хутка і без затрыманьня перавезьці ўсе гэтыя адказьнейшыя грузы — ганаровы абавязак чыгуначнікаў.

Вагонная гаспадарка адна з самых адказных галін чыгуначнага транспарту. Ад яе падрыхтоўкі ў значнай ступені залежыць посьпех выкананьня плянаў гэтых перавозак. Між тым, як вядома, вагонная гаспадарка значна адстала і мае рад сур'ёзных прарываў. Тым большая адказнасьць усклядаецца на вагоньнікаў, якія абавязаны выцягнуць гэтае зьвяно транспарту, даць здаровы вагон сацыялістычным грузам.

Рэалізацыя пастаноў СНК і ЦК аб чыгуначным транспарце — асноўны сродак уздыму работы ўсіх галін транспарту, у тым ліку і вагоннай гаспадаркі. Трэба сказаць, што на гомельскім абменным пункце рэалізацыя пастаноў партыі і ўраду праходзіць дрэнна.

Чым інакш, як не фармальнай перабудовай, можна тлумачыць той факт, што ніякага пералому ў вытворчай рабоце абменнага пункту няма. Не ўзьнялася працоўная дысцыпліна, не палепшылася якасьць рамонту вагонаў, паранейшаму значны лік аварыйнасьці, адпраўленьне цягнікоў бяз усякага агляду.

Факты паказваюць, што ў рабоце абменнага пункту ня толькі няма паляпшэньня, але нездарот. ёсьць пагаршэньне раду паказальнікаў. Так, калі ў студзені пункт здаваў паўднёва-заходняй чыгунцы вагоны з прыплатай па 18 руб. за кожны, дык у ліпені ён здае з прыплатай па 34 руб. Аб чым сьведчаць гэтыя факты? Яны сьведчаць аб тым, што ў справе аадараўленьня вагоннай гаспадаркі ёсьць сур'ёзнае пагаршэньне, што партыйная арганізацыя абменнага пункту піздолела ўзначаліць творчую актыўнасьць перадавых рабочых і па-бальшавіцку змагацца за рэалізацыю пастаноў СНК і ЦК.

Трэба сказаць, што ў абменным пункце ёсьць рад злачынных непаладак у арганізацыі работы. Да гэтага часу не арганізавана справа дастаўкі запасных частак са складу (за некалькі кілёмэтраў) из абменны пункт. Майстар **Шалдыкаў** наогул лічыць, што буксы можна пераносіць на плечах. Намесьнік начальніка вагоннай гаспадаркі **Дамажыр** яшчэ не адвык ад старых мэтадаў работы, кіруе з габінэту, не забясьпечыў бесьперабойную дастаўку запасных частак са складу на абменны пункт. Такія злачынныя адносіны да арганізацыі работы бяэмоўна дрэнна адбіваюцца на своячасовым выкананьні адказьнейшых заданьняў.

Зусім няправільна арганізавана справа выкарыстаньня запасных частак. Да гэтага часу на капвэнцыйны рамонт выдаваліся старыя адрамантаваныя запасныя часткі, у той час, як на бягучым рамонце і абменным пункце атрымліваліся новыя запчасткі. Гэта ў корані няправільна. Канвэнцыя павінна ў першую чаргу атрымліваць новыя запасныя часткі, бо яна выпускае вагон з гарантыяй на тры гады.

На абменным пункце пануе поўная безгаспадарчасьць у справе скарыстаньня розных матар'ялаў. Старыя, але добрыя дошкі і абшыўка ідзе на апальваньне буксаў і на ацяпленьне сталовай у той час, калі іх можна скарыстаць для адказнага рамонту. Наогул з боку гаспадарнікаў няма выстарчальнага апэрацыйнага кіраўніцтва. Адчуваецца нядбайнасьць, непаваротлівасьць, якія прывялі да сур'ёзнага прарыву ў рабоце абменнага пункту.

Трэба з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што рад камуністаў не ўзначалілі барацьбы за ўздым работы, за выкананьне пастаноў ЦК і СНК. Возьмем камуністаў **Шчука, Шафранава, Рудзянкова і Максімава.** Гэтыя «камуністы» страцілі свой партыйны твар. Вось Шчука. Ён узначальвае цэлую зьмену. Работа яго зьмены самая горшая. Замест аздараўленьня вагонаў яна здае сотні вагонаў па актах з вялікімі штрафамі, проста шкодзіць у рабоце. Так, за ліпень зьмена Шчука здала на Паўднёва-Заходнюю чыгунку вагоны з прыплатай у сярэднім па 38 руб. за кожны. Ня лепш і са зьменай Рудзянкова і іншых. Зьмена Рудзянкова здавала ў ліпені ў сярэднім на 39 руб. прыплаты за вагон. Васько — на 34.

Паказвае сапраўдныя ўзоры бальшавіцкай работы — камсамольская зьмена, якая ўдарнай работай па рамонту зьнижае кошт прыплаты і ўжо давяла яе да 15 руб. за вагон. Нельга сказаць, каб гэта зьмена была ў нейкіх асобных умовах. Яна працуе з тымі-ж матар'ялямі, такімі-ж вагонамі і ў аднолькавых умовах.

Замест заахвочаньня камсамольскай зьмены, замест перанясеньня вопыту яе работы ў іншыя зьмены, наглядаюцца выпадкі простага цкаваньня, шкодніцкіх адносін да яе з боку гэтых «камуністаў» **Рудзянкова, Шчукі, Шафранава і Максімава.**

Зьмена Рудзянкова сфабрыкавала фальшывыя акты на брак вагонаў у камсамольскай брыгадзе з тым, каб яе скампрамэтаваць. Сам Шчука замест прыслухоўваньня да крытыкі камсамольскай зьмены, якая выдае сваю штодзённу і ў ёй паказвае на недахопы ў рабоце, цкуе зьмену, імкнецца зацісканць самакрытыку.

На ўсе гэтыя факты партыйная і прафсаюзная арганізацыі не рэагавалі. Яны абышлі і клясава-варожае выступленьне сьлесара кляснага парку вагонаў **Максімцава**, які агітаваў супроць ажыцьцяўленьня пастаноў СНК і ЦК УсеКП(б).

Трэба сказаць, што партыйны камітэт не разгарнуў адпаведнай палітычна-масавай работы сярод вагонаўзяў абменнага пункту, не мабілізаваў на баявую рэалізацыю пастаноў партыі і ўраду. Ніякай работы не праводзіцца па ўздыму сацспаборніцтва, па ўзьнясьці працоўнай дысцыпліны.

Асобна трэба паказаць на такі факт безгаспадарчасьці. Ужо амаль год, як адпушчаны сродкі на пабудову кампрэсарна-выпрабавальнай станцыі для аўта-тормазаў. Пабудову пачалі, але да гэтага часу ні як ня скончаць. Між тым аўтатормазы амаль на 40 проц. неспраўны. У радзе выпадкаў цягнікі адпраўляцца з неспраўнымі аўтатормазамі.

Усе пералічаныя факты сьведчаць аб адным, што трыкутнік дэпо не перабудаваў сваёй работы адпаведна патрабаваньням пастаноў СНК і ЦК УсеКП(б), што і да гэтага часу пануюць канцылярска-бюракратычныя мэтады работы. Партыйная арганізацыя абавязана ачысьціць свае рады ад сабатажнікаў перабудовы, ад клясава-варожых элементаў, якія пралезьлі на абменны пункт, павінна па-бальшавіцку ўзначаліць рэалізацыю пастаноў партыі і ўраду аб уздыме чыгуначнага транспарту.

Рабкор № 6.

Першага студзеня ЦЭЦ павінна даць электраэнэргію чырвонай сталіцы

Буржуазны гэограф чорнасоценец **Сямёнаў** у сваім **«поўным геаграфічным апісаньні айчызны»** даў наступны малюнак выгляду старога дарэвалюцыйнага Менску: **«Касьцёлаў у Менску—тры. Па Захараўскай—люцеранская царква, па Татарскай «великолепная» яўрэйская сінагога».**

Гэтаму заядламу чорнасоценцу і ня сьнілася аб тым, што праз некалькі дзесяткаў год пралетарская рэвалюцыя ператворыць старыя гарады, мястэчкі і вёскі былой Расіі на новы сацыялістычны лад. Сучаснага Менску не пазнаць. Няма больш брудных **Сяхаўні, Камароўскага** пустыру, адышлі ў нябыль пакамячаныя кароб кі конкі, няма больш звароту да газавых ліхтароў. Горад навокал абступілі магутнейшыя карпусы фабрык і заводаў, вуліцы перасечаны чыгуначнымі рэйкамі, па якіх у новеньких трамвайных вагонах кожны дзень праяжджаюць тысячы пасажыраў. Гэтымі днямі ў Менск прыбываюць два магутных савецкіх электравозы, якія будуць перавозіць сотні тон грузаў ў суткі. Вырасла магутная сетка культурна-асьветных устаноў—універсытэт тэхнікумы, школы, бібліятэкі, тэатры, кіно.

Каб прывесьці ў рух карусельныя, такарныя, рэвальверныя, сьвідравальныя варштаты, швэйныя і абутковыя машыны, трамваі, кіно-апараты, каб асьвятліць вялікія аўдыторыі універсытэтаў, школ, рабочыя кватэры, вуліцы гораду, патрэбна вялікая колькасьць электраэнэргіі. А электрычная станцыя — сэрца гораду— ня гледзячы на значны рост сваёй магутнасьці за гады рэвалюцыі, асабліва першай пяцігодкі, сёньня ня ў сілах задаволіць вялікія запатрабаваньні гораду ў электраэнэргіі.

Каб ліквідаваць гэты востры недахоп электраэнэргіі ў Менску пачата будаўніцтва цеплаэлектрацэнтралі магутнасьцю ў 18 тыс. кілёват. Першая чарга станцыі павінна быць пушчана да 1-га студзеня 1934 году. Але на будаўніцтве да самага жніўня былі такія тэмпы, якія ні ў якім разе не гарантавалі пуск турбіны ў тэрмін. ЦК КП(б)Б прыняў рашучыя захады па стварэньні пералому па будаўніцтве. Сваім адкрытым лістом да сакратара ЦК ЛКСМБ тав. **Герцовіча** і камсамольцаў **Менску** аб пасьлы 300 камсамольцаў —дабраахвотнікаў на будаўніцтва ЦЭЦ тав. **Гікало** прад менскай камсамоліяй паставіў вялікую задачу. Тав. Гікало вельмі правільна падкрэсьліў, што **«ленінскі камсамол, які прыняў шэфства над электрафікацыяй усяго Саюзу, ніяк недастаткова праявіў сябе ў нашай рэспубліцы і ў даным выпадку ў будаўніцтве ЦЭЦ».**

Заклік тав. Гікало знайшоў жывы водгук сярод соцень камсамольцаў фабрык і заводаў Менску. У бюро камсамольскіх ячэек пачалі паступаць сотні заяў камсамольцаў аб дабраахвотным жаданьні пайсьці працаваць на ЦЭЦ. На чырвонаштандарным заводзе імя Варашылава падана 60 заяў, на заводзе імя Молатава — 20.

Да 5-га жніўня на будаўніцтва прыбыла 150 камсамольцаў — дабраахвотнікаў. Хлопцы і дзяўчаты надзвычай хутка зьмянілі такарныя варштаты, ціскі, швэйныя машыны на тачкі, насілкі. З прыходам камсамольцаў ажыла пляцоўка будаўніцтва. Яна пачала з кожным днём набіраць усё большыя і большыя тэмпы. У выніку ўдарнай самаадданай работы заданьне другой пяцідзёнкі жніўня на першым рашаючым вучастку— галоўным корпусе, дзе будзе зьмяшчацца сэрца станцыі—турбіна—выканана на 100 проц. Такіх тэмпаў будаўніцтва ЦЭЦ яшчэ ня бачыла. Уверх пайшла крывая на гідратэхнічнаму абсталяваньню (вучастак, на якім з-за адсутнасьці рабочай сілы была зусім спынена работа).

Хуткімі тэмпамі ідзе забойка свай у 40-ка мэтровы самацёчны канал. Мейсцамі на калена ў вадзе вядуцца работы. Але гэта ня зьнижае вытворчага энтузіязму ўдарнікаў. Яны яшчэ з большай настойлівасьцю і ўпартасьцю змагаюцца за пасьпяховае скончэньне будаўніцтва ЦЭЦ.

На забойцы свай працуюць выключна камсамольскія брыгады т. т. **Шуціка і Шавардзіна.** Аб іх ударнай рабоце павінна ведаць ня толькі камсамольская арганізацыя, але і ўся пралетарская грамадзкасьць. Паглядзімо на зводку іхняй выпрацоўкі. Па водле норм кожная брыгада павінна забіць за дзень 14-16 свай, а брыгады Шуціка і Шавардзіна забіваюць па 25-30 штук.

Ударна працуе брыгада варашылаўцаў па падачы цэглы. Сваё штодзённае заданьне яна выконвае ад 115 да 125 проц. За камсамольскімі брыгадамі значна пацягнуліся і астатнія брыгады рабочых. Беспартыйны шофэр тав. **Касатчыкаў**, які працуе на перавозцы цэглы, замест чатырох рэйсаў у дзень робіць шэсьць. Брыгада камсамольцаў, якая працуе на нагрузцы цэглы абвясьціла сябе ўдарнай брыгадай імя тав. Гікало, узяла самаабавязацельствы і пасьпяхова іх выконвае.

Зараз будаўніцтва ЦЭЦ стаіць перад новымі адказьнейшымі задачамі. Трэба з усёй бальшавіцкай напорыстасьцю павялічыць тэмпы, скараціць тэрміны будаўніцтва. Да 19 МЮД, на дэкаду раней тэрміну, павін на быць вывезена пад страху машынная заля, забэтаніраван самацёчны канал і аванкамэра. За дзьве дэкады павінна быць укладзена ў гэтыя вучасткі 1.445 кубамэтраў бэтону.

Задачы надзвычай адказныя. На іх выкананьне павінна быць мабілізавана ўся савецкая грамадзкасьць Менску. Трэба найхутчэй скончыць пасьлі ку астатніх 150 камсамольцаў. Сабатаж дырэктывы партыі, які наглядаецца на радзе прадпрыемстваў з боку гаспадарнікаў, сакратароў партыйных калектываў у выглядзе затрымкі камсамольцаў павінен быць ва што-б там ні стала зломлен. Людзі, якія затрымліваюць камсамольцаў—не разумеюць гаспадарчага і палітычнага значэньня ЦЭЦ для чырвонай сталіцы. Гэтыя людзі падыходзяць да пасылкі камсамольцаў са сваіх вузкіх, цэхавых інтарэсаў.

Гарком КП(б)Б даў жорсткую і выразную дырэктыву, каб на працягу двух дзён скончыць пасылку камсамольцаў на ЦЭЦ. Партыйныя калектывы павінны забясьпечыць выкананьне гэтай дырэктывы.

Часу да скончэньня будаўніцтва засталося вельмі мала. Пасланае камсамольскае папаўненьне на будаўніцтва пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі павінна забясьпечыць пуск цэху да першага студзеня.

Х. Б.

Усесаюзны агляд падрыхтоўкі да навучальнага году

АЧЫСЬЦІЦЬ ШКОЛЬНЫЯ ПАМЯШКАНЬНІ АД ПРЫВАТНЫХ ЖЫХАРОЎ

Пастанова ўраду аб аслабаненьні школьных памяшканьняў ад жыхароў і ўстаноў адносіцца ў першую чаргу да гарсаветаў.

Як адносьліся да гэтай задачы ў Менску? У мінулым годзе (улетку 1932 г.) ні аднаго школьнага пакою ня было вызвалена. Школы працавалі ў дзьве (а некаторыя ў тры) зьмены, у цесных пакоях, у той час, як дзесяткі поўных кватэр заняты прыватнымі жыхарамі. Так, 28-ая яўрэйская і 15-ая беларуская ФЗС цесьняцца ў адным не вялікім доме—і то першы паверх амаль увесь занят іншымі асобамі і ўстановамі, прычым два вялікія пакоі заняла крама Таргсіну яшчэ ў мінулым годзе. У такім-жа становішчы знаходзіцца і 17-ая яўрэйская ФЗС, якая месьціцца на 1-м паверсе. Школе не хапае пакояў для ўсіх сваіх 13 груп. Ужо нельга тут гаварыць аб сталоўцы, аб фізкультурнай, аб добрай настаўніцкай, пакоях для майстэрань і г. д. Астатнія-ж два паверхі заняты прыватнымі жыхарамі, якія спакойна сядзяць і чакаюць высьленьня школы з 3-га паверху.

Гэтыя факты не адзіныя. Усе ведаюць, у якіх умовах працуюць 3-ая, 9-я і 33-я ФЗС, якія скучаны ў адным будынку з 50 трупамі і тысячамі дзяцей. І ў гэтым будынку ёсьць некалькі занятых прыватнымі жыхарамі пакояў— і не «удалося» да гэтага дня аслабаніць гэтыя пакоі. У такім становішчы знаходзіцца амаль усе менскія школы.

Ня лепшае становішча і ў гэтым годзе.

На сваіх пасяджэньнях прэзыдыум гарсавету выносіць «баявыя» пастановы аб безадкладным высьленьні прыватных жыхароў з памяшканьняў школы. Але гэтыя пастановы зьяўляюцца толькі самастраховачнымі, сапраўдным «очковтирательством»: «пастановы ёсьць, але выконваць іх гэта не магчыма».

Зусім «проста» ставіць пытаньне загадчык адділу камтасу тав. Кавалёў. Ён заяўляе, што ведае аб усіх пастановах ЦК і ўраду аб школе, ведае аб пастановах прэзыдыуму гарсавету («Я сам член прэзыдыуму гарсавету») пра высьленьне прыватных жыхароў са школ... Але ў яго, бачыце, шмат кватэрных спраў. У яго, ня толькі школьныя справы, ёсьць у яго шмат пасталі сродкі з Ворпы, Магілёва, Бабруйску, Барысава, Сянно і іншых раёнаў. Трэба ўдзесяцярыць тэмпы збору сродкаў, пакончыць з апартуністычнымі самацёкам у гэтай справе.

Магілеў адстае

У Магілеве збор сродкаў на пабудову эскадрыльі імя тав. Кагановіча праходзіць незадавальняюча. Па гораду сабрана толькі 6.403 рублі 75 капеек. Па асобных прадпрыемствах і установах збор сродкаў ідзе наступным чынам: шаўковая фабрыка — 3.000 руб., «Адраджэнец» — 650 руб., рымарная — 200 руб., «Пралетары» — 93 руб. 75 кап., фінбанкработнікі — 175 руб., дзетканіцы — 300 руб., цэгельня № 7 — 100 руб., арцель «2 мая» — 250 руб., мясакамбінат — 200 руб., завод «Зара» — 60 руб., Мэталякамбінат — 500 руб., пленум РВК — 300 руб.

Перадавым па зборы сродкаў ідзе мэталякамбінат, які пры невялікай колькасьці рабочых і служачых сабраў ужо 500 руб.

Зусім нічога ня робіцца па зборы сродкаў па вёсцы.

(Белта).

Уносяць і выклікаюць

* Дзяржыўлісі і пораменьскі Вуць лянскага сельсавету, Пухавіцкага раёну, арганізавалі суботнік па ўдарным будаўніцтве. Усе заробленыя грошы перадаюць у фонд эскадрыльі імя тав. Кагановіча. У бліжэйшыя дні яны пачынаюць сваю адзін суботнік і заробленыя грошы таксама адаюць на пабудову эскадрыльі. Пораменьскі выклікаюць на сацыяспаборніцтва всіх пораменьскіх і панарыцкіх Пухавіцкага раёну.

**

Накіраваць усю ўвагу Веткаўскай партарганізацыі на своячасовую, добраякасную ўборку ўсіх культур, на датэрміновае выкананьне ўсіх абавязкаў перад дзяржавай

ПОСЬПЕХІ ЎБОРКІ ВЫРАШАЮЦЦА У БРЫГАДЗЕ

Ветка—адзін з буйнейшых сельска-гаспадарчых раёнаў, які мае спэцыяльна-вырашчаны жывёлагадоўчы і бульбяны напрамак. Побач з вялікай плошчай, занятай пад бульбай, кормаплодамі і ўкоснымі травамі, якія складаюць кармовую базу для жывёлагадоўлі, у раёне засеяна 22.736 га азімых і яравых культур. Па велічыні плошчы пад збожжавымі культурамі Ветка займае 12-е месца сярод усіх раёнаў БССР.

Улічваючы вялікую патрэбнасьць у затраце працы на ўборку працаёмкіх культур у раёне, асабліва самае значэньне мае своячасовая і добраякасная ўборка азімых і яравых, каб не зацягнуць ні на дзень уборкі гэтых культур і своячасова пераключыць усю рабочую сілу, плугі і наяўныя машыны на ўборку ўсіх пазьнейшых культур.

Масавая ўборка азімых і ранніх яравых у раёне пачалася з 25 ліпеня, а закончана жніво жыта толькі 11 жніўня, замест вызначанага ліпеньскім пленумам ЦК і ЦКК КП(б)Б тэрміну 3-5 жніўня. Ня ўкладваецца таксама раён і ў тэрміны ўборкі яравых.

Зразумела, што такая зацяжка шыкіні спасылаўшымі на шматлікія прычыны ня можа быць апраўдана. Істотнымі шкодными для справы выступаюць спробы многіх мясцовых работнікаў і асобных раённых кіраўнікоў спасылацца на тое, што ўборку нельга не зацягнуць пры ўмовах адсутнасьці ў раёне МТС, калі жніво пераважна прыходзіцца рабіць ручным спосабам.

Мы маем шмала прыкладаў, нямала калгасаў («Чырвоны баец», Радутскага сельсавету, «Ударнік», Сівошскага сельсавету, імя Варашылава, Прысьнянскага сельсавету і інш.), дзе па-бальшавіцку ўпачатаен творчы энтузіязм калгасных мас, дзе правільна арганізавана работа паляводных брыгад і праводзіцца мэтадамі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. У такіх калгасах уборка заканчваецца ў дакладна вызначаныя тэрміны, не пакідаецца ні аднаго коласку ў полі, не дапускаецца ніякіх страт як пры ўборцы, так і пры малацьбе.

Калгасьнікі ў асноўнай масе ўсьвядомілі, якія шырачэйшыя магчымасьці для палепшэньня іх дабрабыту прадастаўлены сацыялістычнай перабудовай сельскай гаспадаркі, усьвядомілі, што палепшэньне дабрабыту залежыць ад добрасумленнай працы ў калгасе. Адносіны да працы ў параўнаньні з мінулым змяніліся. Калгаснае жыцьцё і праца перарабляе псыхалёгію селяніна, павышае яго палітычны і культурны ўзровень.

Мала такіх у раёне калгасаў, дзе ня было-б сапраўдных ударнікаў працы па сацыялістычных палёх, якія перавыконваюць нормы выпрацоўкі і падаюць узорныя прыклады для ўсіх астатніх сваёй работай і клопатамі за добраякасную ўборку, без найменшых страт, за своячасовае выкананьне абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай па збожжапастаўцы.

На жаль, лепшыя вопыты і ўзоры работы перадавых брыгад і калгасаў ня робяцца шырокім здабыткам усіх астаючых. У большасьці калгасаў слаба праводзіцца палітычна-выхаваўчая работа. Многія з партыйных ячэек, якія прайшлі ўжо чыстку, не ўзяліся яшчэ па-сапраўднаму за рэалізацыю пастановы праверкомаў. Работа з беспартыйнымі актывам у калгасах і кіраўніцтва сацспаборніцтвам застаюцца па-ранейшаму найбольш слабым месцам. Далёка ня ўсе камуністы, якія працуюць на калгаснай вытворчасьці, усьвядомілі, што ад ступені арганізацыі калгаснага актыву і работы з ім залежыць пасьпяховае правядзеньне ў жыцьцё дырэктыў партыі, посьпех у мабілізацыі шырокіх калгасных мас на барацьбу з кулацкімі элементамі, злодзеямі, лодырамі, з усякай антыкалгаснымі элементамі. Недахопы работы з актывам ігнараваньне масавай работы ў брыгадзе можа прыводзіць толькі да адмоўных вынікаў. У самым буйным калгасе імя Сталіна, які мае рад блёкучых паказальнікаў сваёй работы і лічыцца ў перадавых радах барацьбітоў за высокі ўраджай, не забясьпечан атопрацаднны выхад на працу ў часе ўборкі ўсіх працаздольных. У брыгадзе № 7 гэтага калгасу мелі месца нават такія выпадкі, калі асобныя калгасьнікі пайшлі на працу да аднаасобнікаў.

Для хутчэйшай ліквідацыі недахопаў у рабоце па ўборцы неабходна веткаўскай раённай і партарганізацыі ўмацаваць палітычна-выхаваўчую работу непасрэдна ў брыгадзе, у зьяне, з тым, каб кожны калгасьнік добра разумеў-бы, што «ад іх работы па пасьпяховым завяршэньні рэзультатаў сяўбы і ўборачнай кампаніі залежыць хуткае ўзроўню іх жыцьцяпіто ўсе без выключэньня калгасы і калгасьнікі пры пасьпяховым завяршэньні сельска-гаспадарчага году маюць усе магчымасьці, акуратна выканаўшы свае абавязацельствы перад дзяржавай па здачы сельгаспрадукцыі, зрабіць вялікі крок наперад да выкананьня лёзунгу тав. Сталіна—зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі» (з пастановы ліпеньскага пленуму ЦК КП(б)Б).

Важнейшай і неадкладнай задачай зьяўляецца спалучэньне ўборкі і абмалоту з выкананьнем збожжапаставак. Веткаўскі раён павінен здаць дзяржаве 2.775,9 тон збожжа, з якіх 738,5 тон калгасы, рэшту аднаасобныя сэктар.

На 10 жніўня пастаўлена калгасамі 191,5 тон і аднаасобнікамі 336,6 тон збожжа, што складае 18,9 проц. гадавога плану. У перадавых радах па своячасовай здачы добраякаснага збожжа дзяржаве будуць калгасы Р.-Слопіцкага сельсавету, якія выканалі на 66 проц. гадавы план, А. Рудзянскага—65,6 проц., Барталамеёўскага—60 проц., Бясядзкага—48 проц., Калінінскага—46 проц., Прысьнянскага і Шарсьцінскага—42 проц.

Асобныя калгасы («Решительный»—Тарасёўскага сельсавету, «Шлях да сацыялізму—Ухоўскага сельсавету і «Прагрэс»—Акшынскага сельсавету) сталі на шлях сабатажу дырэктыў партыі аб збожжапастаўках, пачалі разбазарваць першы абмалот, нічога не здаючы дзяржаве.

Пасьля сыгналу «Зьвязды» аб падобных фактах райком партыі рашуча ўдарыў па сабатажнікам. Старшыні калгасу «Прагрэс» абвешчана суровая вымова з папярэджаньнем, ушаўнаважаны РК Іванчыкаў выключан з партыі. Гэта рашэньне павінна зьявіцца суровым папярэджаньнем для ўсіх тых, хто пад тым ці іншым выглядам імкнецца шкодзіць дырэктывы партыі, зрываць своячасовае выкананьне ў раёне плянаў па абавязковай пастаўцы збожжа дзяржаве.

На 12 жніўня Веткаўскі раён выканаў жнівеньскі плян здачы збожжа дзяржаве на 106,2 проц. Маючы плян у 712 тон, раён здаў 756 тон.

З-ПАД МАЛАТАРНІ

Позьні вечар... Ветка адпачывае. Раённыя ўстановы пустуюць. Толькі ў райкоме партыі ў адным пакоі ярка блішчыць лямпачка і загадчык аргаддзелу **Панкоў** упісвае ў свой блёкнот весткі аб паступленьні збожжа. Ён рыхтуецца да выезду ў наступны дзень па маршруту **Бесадзь-Рэчкі, Акшынка, Ухава.** Тут слабейшыя месцы і на ўборцы і па збожжапастаўках.

Рад работнікаў райкому з першых дзён уборкі штодзенна бываюць у калгасах, даюць канкрэтныя парады і ўказаньні. Галоўны ўпор — па якасьць уборкі і арганізацыю паставак з першага абмалоту.

***

Калгас імя **Варашылава.** На прасторных палёх ірыгожаных пазалотай новага ўраджаю шумна лясковa жнівярка. Шурпыць пад спрэмай раз горнутага фронту жаючын жыта, густа кладуцца адзін ля другога тугія снопы.

— Ня жыта, а чарот,—з гонарам прыпадымае да верху толькі што зрэзаную жменю жыта ўдарніца першай брыгады.

На вучастку чацьвертай брыгады грыміць наўскладаная машына: **малоціць, вее.** Пузатыя сьпіркі саломы хутка ўзьнімаюцца ўгару.

У першы дзень абмалоту калгас **адвёз на прыстань тэзку збожжа.** Больш павезьці рызыкоўна было, каб не забракавалі. Першая тона была пробнай. Праз дзень адвезьлі яшчэ **1.050** пудоў. **Гэта—гадавы плян па жыту.**

На гумне калгасу імя **Леніна, Акшынскага** сельсавету шырокая паляна ўслана посьцілкамі. На іх дасушваецца жыта і ячмень. Калгасьнікі рушліва рыхтуюцца да выезду напач з тым, каб першымі заняць чаргу на пункце.

У калгасе **«Прагрэс»** сустракае нас старшыня Булановіч.

— Як справа з малацьбою?

— Ды крыху малацілі, — скрозь зубы цэдзіць **Булановіч.**

А колькі дзяржаве здалі вы з гэтага «крыху»?

***

Спакой мястэчка парушаецца грукатам калёс доўгіх абозаў, якія з усіх бакоў цягнуцца да прыстані з мяшкамі збожжа. Штодзень, то ўсё больш становіцца шматлюдна.

Масавы паток абозаў са збожжам застаў кіраўнікоў загатзбожжа непадрыхтаванымі. На прыёмачным пункце вялікія заторы. Тры прыёмачныя не спраўляюцца з работай. Фурманы прастойваюць па 3-4 гадзіны. Ля вагаў вялікі натоўп і мітусьня. Сыстэма арганізацыі прыёмкі збожжа, не гарантуе ад магчымага раскрадваньня. Няма на складзе спэцыяльнага чалавека для даведак па розных справах. А бывае вось як:

—Колькі мой клумак заважыць, —зварачаецца да вагаўшчыка Брандукова аднаасобнік з вёскі Рудня, — **Фіцаў.**

— Там запісана, глядзеце вачыма і ўбачыце!

— Запісана 26 кгр., а калі было на возе мне сказалі—27.

— Не 27, а 27 без 200 грам!—пэрвова навучае прыёмшчык.—На мяшок адлічылі 600 грам, ну, а 200 грам, як я табе буду запісваць? Калі ты ўжо вельмі прыдзіраўлівы, дык я табе прыпішу сваіх 200, толькі ня бузі.

Такія работнікі прыёмачных пунктаў, як **Брандубаў** за злачыннае ігнараваньне інтарэсаў здатчыкаў павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Патрэбна дакладнасьць у возе, квітках і яснасьць у тлумачэньні такіх пытаньняў. І калгасьнік, і аднаасобнік у аспоўнай масе ўсьвядомілі і паважаюць закон ураду аб цьвёрдых пастаўках. Наколькі вялікі пералом у сьвядомасьці мас—сьведчыць штодзённае нарастаньне тэмпаў здачы добраякаснага збожжа. За першую пяцідзённку жніўня здана 70 тон, а за другую—460 тон.

Збожжа з-пад малатарні арганізаваным парадкам, масавымі абозамі штодзенна паступае на прыёмачны пункт. Дзень і ноч грукацяць калёсы, чуцен вясёлы гоман калгасьнікаў, якія вязуць дзяржаве жыта, ячмень і іншыя культуры, якія будуюць заможнае калгаснае жыцьцё.

Я. Івашын.

Брыгадзір другой брыгады калгасу „Шлях да сацыялізму" Гузоўскі

Камсамольцы авалодваюць сельска-гаспадарчай вытворчасьцю

Бабруйская чыгуначная камсамольская ячэйка мабілізавала мэтэ ў ліку «600» на пастаянную работу ў вёску і ў прасавіку прыехаў я ў калгас. Тут мяне выбралі сакратаром камсамольскай ячэйкі і прыкінулі брыгадзірам другой брыгады.

Пачатак маёй работы супаў з пачаткам разгортваньня веснавой сяўбы. Усю сваю работу падпарадкаваў я задачы — **дабіцца ўзорнай работы камсамольцаў на калгасным вытворчасьці і апраўдаць сябе на рабоце па кіраўніцтву палявочай брыгадай.** Каб аўладаць неабходнымі ведамі агратэхнікі, я стараўся выкраіць свабодную хвілінку для чытаньня літаратуры па пытаньні сельска-гаспадарчай тэхнікі, рабіўся, пытаўся ў старых вопытных калгасьнікаў і брыгадзіраў пра ўсё тое, што для мяне было на зусім ясным.

У масава-растлумачальнай рабоце сярод калгасьнікаў брыгады галоўны ўпор рабіў я на ўмацаваньні працоўнай дысцыпліны, на развіцьці сьвядомых сацыялістычных адносін да працы ў калгасе.

Брыгада, у якой я працаваў у часе веснавой сяўбы як па тэрмінах выкананьня пасеву яравых, так і па якасьці працы засталася не на апошнім месцы, так што ў часе ўборкі праўленьне калгасу мяне вылучыла ўжо за старэйшага брыгадзіра.

Па лініі работы ў ячэйцы я дабіўся таго, што камсамольцы-калгасьнікі ніхто ня можа ўхіляцца ў дрэнных адносінах да працы. Абсалютная большасьць камсамольцаў працуе ўдарна.

У маёй брыгадзе 75 чалавек, у тым ліку 5 падлеткаў. За 9 дзён мы скончылі жніво 66 га жыта, прычым жніво прыходзілася праводзіць пераважна ручным спосабам. Аспоўная маса калгасьнікаў працуе дружна. На жніве працавалі ад цямна да цямна. Шмат калгасьніц—**Вольская Марфа, Ступінская Аўдоцьця, Карначова Саша, Драбушэўскі Янка, Вольскі** і інш. сыстэматычна перавыконваюць нормы выпрацоўкі. Нават начны вартаўнік **Гулевіч** з той у дзень выходзіць на працу, дапамагае вязаць снопы.

Ёсьць у нас і падрыўшчыкі калгаснай вытворчасьці. Каля 10-ці чалавек, галоўным чынам з ліку новапрыйнятых у калгас, перэгулярна выходзяць на працу. Найбольш злосьнымі прагульшчыкамі зьяўляюцца **Гасў, Дзям'янаў** і **Засядацеляў.** Праўда, які з Гаева, напрыклад, калгасьнік, калі да гэтага часу ён яшчэ нічога са сваёй маемасьці не абагульніў? А праўленьне калгасу патурае такім, як Гасў, і такім, як наш мэханік па малацьбе Ступінскі, які замест працы гарлапаніць аб неабходнасьці зьніжэньня норм выпрацовак і шаогул уносіць дэзарганізацыю сярод найбольш адсталых калгасьнікаў.

І ў выніку такой апартуністычнай дзейнасьці ў калгасе груба парушаны дырэктывы партыі аб натуральным авансаваньні калгасьнікаў. З першага абмалоту праўленьне калгасу $^{2}/_{3}$ збожжа разьмеркавала па працаднёх, а толькі $^{1}/_{3}$ здало дзяржаве.

Наша брыгада спаборнічае з першай брыгадай. Пры папярэдняй праверцы выкананьня дагавораў выявіліся ў першай брыгадзе факты шкодніцтва і пак ражы калгаснага дабра. Калгасьніца **Белякова Мар'я,** жнучы жыта, пакідала за сабой выпычэй у паўаршына бруньчыча і прытоптвала да зямлі калосы. А яе муж **Драбушэўскі Фёдар** у зручны час падбіраў іх.

Гэтыя злачынцы дагэтуль застаюцца непакаранымі. Не хапае ў нас пільнасьці да клясавага ворага. А кіраўніцтва калгасу апартуністычна ўхіляецца ад барацьбы з імі. Трэба, каб раённыя кіруючыя арганізацыі зацікавіліся справамі нашага калгасу.

СПАБОРНІЦТВА БРЫГАД

Глытаў Міхась сёньня, як і заўсёды падняўся яшчэ да ўсходу сонца. Ён першым зьявіўся на калгасны двор, агледзеў жнівярку, зухліва прабег па стайні і адтуль накіраваўся да пастаўленых у стройны рад фурманак, — кідаў свой презорлівы позірк на калёсы, выпытваў, загваздкі, правяраў, ці ўсё падмазана.

Тым часам двор хутка напаўняўся людзьмі. Учора вярнуліся з поля позна. Жнівярка пры лікгары даканчвала апошні квадрат жыта. Таму калгасьнікі брыгады **Глытава** атрымліваюць пуцёўкі не як заўсёды—з вечара, а раніцай.

У блёк-ноце **Глытава** запісала 55 чалавек.

— А колькі ня вышла ў вас сёньня? — цікавімся пасьля разьмеркаваньня брыгады па вучастках работы.

Глытаў выцягнуў з кішэні замусолены спытак, прабег вачмі па сьпісе і ўсьміхнуўся ў сваю рыжую бараду.

— Прагульшчыкаў няма, — адказвае ён. — Летась штодзенна, і ўвечары і раніцай, прыходзілася кожнаму парогі абіваць, заграпаць на працу. А сёлета справа зусім іншая. Нібы людзі ня тыя сталі, загадваць ужо ня трэба, кожны сам зацікаўлен у працы. Самі прыходзяць і настойліва працы патрабуюць!

Распачалася ўборка, усе роем рушылі на поле, працуюць па-гаспадарску, не па сонцу, а так, каб больш і лепш зрабіць, ведаючы, што ад таго, як будзеш працаваць, залежыць і заробак твой.

Адзін толькі калгасьнік аганьбіў сябе ў гэты напружаны гарачы час. Гэта — Кудраўскі, які цэлы тыдзень лыцы біў, рукамі не датыкнуўся да ўборкі жыта. Два разы папярэджваў яго. Прыйшлося зараз на яго заяву ў праўленьне падаць, як на сабатажніка ўборкі.

Першая брыгада тав. **Глытава** працуе мэтадамі сацыялістычнага спаборніцтва. Большасьць жанчын на жніве са дзіцямі ў дзень перавыконвае нормы выпрацоўкі. Жнівярка **Гаксама** замест 4,5 га ў апошнія дні давала 5,5 га. Такім чынам, брыгада за 8 дзён поўнасьцю скончыла жніво 40 га жыта. Брыгада зжала і зьвезла на пункт абмалоту жыта, не як кінуўшы ні аднаго коласка ў полі. Каласы зграбаліся раніцой, з расою, каб ня высыпалася зерня.

У працэсе ўборкі **Глытаў** праводзіў кароткія вытворчыя нарады, своячасова запастраючы ўвагу калгасьнікаў на недахопах работы.

Брыгада **Глытава** спаборнічае па своячасовую і добраякасную ўборку з трэцяй брыгадай **Работа Івана.** Апошняя адставае ва ўборцы жыта і ячменю. Брыгадзір тлумачыць гэта тым, што ў складзе трэцяй брыгады — калгасьнікі сёлетняга прыпіву, якія адрываюцца ад работы ў калгасе на ўборку сваіх неаграмаджаных палосак.

— А чаму каласы валяюцца па вучастку трэцяй брыгады?

— Пагоніўся за каласамі — спаны страціў, — з выглядам таленавітага арганізатара палявых работ адказвае **Рабы.** — Каласы підзе ня дзенуцца, зграбем яшчэ»!

Калі гутарыш з **Рабым,** стараецца ўражаньне, што ён усё стараецца як-бы апраўдаць адставаньне і недахопы сваёй брыгады, а вось, каб перанять добры вопыт работы першай брыгады — ён і ня думае...

Н. Т.

Калгас імя Варашылава, Прысьнянскага сельсавету.

Кулацкая махінацыя ў калгасе „Праўда"

Вясной старшыня калгасу «Праўда», Мар'інскага сельсавету, **Кірыленка** і сакратар парт'ячэйкі **Тапленкін** шумна рапартавалі раённаму кіраўніцтву аб перамогах на пасеўным фронце. Хвалілі сябе за звышударныя тэмпы, перавыкананьне плянаў. Рапарты ілюстравалі лімбамі, паказвалі перавыкананьне плянаў па 2 га па ільну і на 3 га па просу.

Перавыкананні плян і чамусьці зямлі засталося шмат у запасе. На зямлю проста такі шанцуе калгасу! І плянавай, і па-заплянавай—хоць адбаўляй. Аказалася нейжмі чынам 60 га зусім непатрэбнай калгасу зямлі.

Лішняя, дык лішняя, навошта яе ўводзіць у плян?—парашылі плянуючыя і кіруючыя людзі ў габінэце райза.

Лішкі зямлі сталі прадметам меркаваньня кіраўніцтва калгасу і кіраўніцтва Мар'інскага сельсавету. Аб чым мяркавалі яны—нам невядома. Мы толькі даведаліся аб прыцыпе вырашэньня гэтага пытаньня.

Праўленьне калгасу «Праўда» ўвайшло ў гаспадарчы «кантакт» з адзіначасобнікамі суседняга Добрускага сельсавету, Гомельскага раёну. Па аформленаму дагавору калгас здаў у арэнду аднаасобнікам 60 га зямлі, за што і атрымаў 6.000 руб.

Куды і на што прамотаў **Кірыльчык** гэтыя 6.000 руб.—нам таксама невядома. Нас толькі пікавіць, як магла заставацца ў сакроце на працягу больш паўгода кулацкая правакацыя кіраўніцтва калгасу «Праўда» і Мар'інскага сельсавету, якое, груба парушаючы наша законадаўства аб зямлькарыстаньні, пайшло па шляху даў по скаваўшага ў нас абшарніцкага панаваньня?!

І хіба ня дзіва, што ўсё гэта адбывалася ў 7-мі кілёмэтрах ад раённага цэнтру — **Веткі...**

Якуб Мароз.

Ад рэдакцыі: Надаючы вялікае значэньне гэтаму факту, **«Зьвязда»** патрабуе неадкладнага расьсьледаньня і прыцягненьня да суровай адказнасьці вінаватых у здачы ў арэнду калгаснай зямлі.

На вытворчай нарадзе

Пасьля дзённай напружанай работы ў полі, брыгада № 1 калгасу «Савет» сабралася на вытворчую нараду.

Брыгадзір Булавіцкі заявіў, што трэба падагуліць вынікі работы на ўборцы за першую пяцідзённку і пераглядзець склад ударнікаў.

Галоўную ўвагу нарада сканцэнтравала на дапушчаным у брыгадзе адрыве ад уборкі і малацьбы і збожжапаставак. А справа вось у чым.

Павсюдне плянну брыгада павінна была са свайго вучастку здаць 200 пудоў жыта. Столькі ўжо і намалочана, трэба толькі на пункт адвезьці. Але бяда ў тым, што з гэтай колькасьці сухога жыта ўсяго толькі 100 пудоў.

Нарада пастанавіла, што затрымліваць у сьвіране жыта недапушчальна, трэба сёньня-ж ночу адвезьці збожжа на пункт, а астатняе прасушыць і па заўтра адправіць.

Нарада таксама абмяркоўвала канкрэтны плян работы кожнага члена брыгады пасэкальна. У прыклад другім прыводзіліся лепшыя ўдарнікі—**Шаціла К., Грамыка П., Грамыка С.** і інш., якія сыстэматычна перавыконваюць нормы выпрацоўкі і падаюць узоры высокай якасьці работы. Разам з тым выяўлены і прагульшчыкі-лодыры—**Грамыка М. і Капітоніха.** Нарада вынесла прапанову на першы раз пакараць іх штрафам і занесьці на чорную дошку.

Прапановы вытворчых нарад даклад на выконваюцца членамі брыгады, якія па-ўдарнаму змагаюцца за своячасовую і добраякасную ўборку ўраджаю, за выкананьне абавязкаў па збожжапастаўках.

Перная брыгада спаборнічае з другой. Пункты сацыялістычнага дагавору зьяўляюцца неадступным абавязкам калгасьнікаў з брыгад **Булавінскага,** якая ідзе наперадзе.

Пятро.

Пакончыць з ігнараваньнем ільнацерабілак

ЧАВУСЫ. Калгас «Партызан» атрымаў першы пяток па здачы сена. Ён-жа ў першую чаргу ў лік абавязковых збожжапаставак здаў 1.254 кгр. чыстага і сухога ячменю, у якім ня было ні аднаго процанту засьмечанасьці і вільготнасьці.

У калгасе пры жніве асабліва ўвага зьвернута на барацьбу са стратамі. Да жнівярні прыпасаван зерняўборнік, арганізаваны брыгады па зьбіраньні калосоў.

Адпачасова са жнівом калгас **«Партызан»** першым у раёне пачаў і перабраўшае ільну. Лён у калгасе вялікі і чысты. Гета вынік клапатлівай яго апрацоўкі (лён палоўся два разы). Яшчэ на 9 жніўня было выцерабілена 5 га ільну.

На гэтым фоне зусім вызначальным зьяўляецца той факт, што ў калгасе на перабраўшую ільну не скарыстоўваецца ільнацерабілка. Дырэктар МТС **Рабіе** заражан ультыхаўтарскімі настроямі і рашыў, што ільнацерабілка ільну гета маньяка ня прыдатна». У выніку маньяка і да гэтага часу стаіць сярод поля і іржавее. Між тым, пры ўмелым скарыстаньні ільнацерабілкі можна дасягнуць вялікага эфэкту ў рабоце.

П. С-кеў.

ШЭФБАЗА ЗАВОДУ ІМЯ МОЛАТАВА ПРАМАРГАЛА ПАДРЫХТОЎКУ ДА ЎБОРКІ

Калі вынікшая ў старшыні шэфбазы мозкага дрэвапрацоўчага заводу імя Молатава тав. **Сьцешко** як яго блоча дапамагае падшэфнаму **Ратамскаму** сельсавету — сьлецце адказ:

— калі-б усе шэфы так дапамагалі, як мы, было-б вельмі добра!...

Адказваючы так, т. Сьцешко крыўдзіць душой і сьвядома падтасоўвае даты. Вышэй прыведзеная ацэнка можа быць адносна толькі да пэрыяду веснавой сяўбы. Тады шэфбаза заводу імя Молатава аказала падшэфным калгасам сапраўды вялікую дапамогу і сваёчасова адрацавала лепш за ўсіх. Але пасьля скончэньня сяўбы шэфбаза заводу імя Молатава дазволіла са бо доўгую перадышку, якая цягнулася амаль да самага пачатку ўборкі. Такім чынам адзін з адказьнейшых пэрыядаў — пэрыяд падрыхтоўкі да ўборкі—прайшоў міма шэфскай арганізацыі Таму зараз, у часе ўборкі, выяўляюцца такія недахопы, якія можна было-б своячасова папярэдзіць і ўхіляць.

Буйнейшы калгас у сельсавеце—**«Кастрычніцкая рэвалюцыя»,** які засеў каля 1.200 га ральлі, мае 10 жнівярак і 3 спатрэбзалкі. Які быў абавязак шэфа? Праверыць, ці ўсе машыны ў спраўнасьці, праверыць якасьць рамонту. Замест гэтага шэфы пасылалі былому старшыні праўленьня калгасу тав. **Манарзвічу** (зараз памесьяк старшыні) і былому брыгадзіру кулаку **Вірэйкіну** (зараз зьнят з работы і адцан ад суд), якія проста «стэрли очи», заявіўшы, што ўсё ў спраўнасьці, усё зроблена. У першы-ж дзень выхаду на ўборку з 9-ці жнівярак (адну так і не адрамантавалі да сёмнаццатага дня) 4 выйшлі са строю, з 3-х спалавязалак адмовілася працаваць дзьве. У калгасе спазыбіся пакліны настрой. Тэрмінова выклікалі з Менску мэханіка. Машыны палрацвілі на скорую руку. Але ўсё-ж яны працуюць з перабоямі, хутчэй больш стаяць, чым працуюць. Асабліва часта ламаюцца драўляныя часткі (граблі, подці), бо, пасьле слоў сакратара парт'ячэйкі сельсавету тав. **Бэнера,** гэтыя часткі зроблены з мяккага і вільготнага дрэва. Запасных частак не падрыхтавалі. Не падрыхтавалі такой зробкі, як сьпіральная спружына, аб якой, між іншым, у калгасе гаворыць больш году.

Частым палонкам спрыяе і тое, што ня ўсе калгасьнікі ўмеюць абыходзіцца з машынамі. Гэтыя дробязі можна было даўно ліквідаваць. Можна было прымацаваць да калгаснай кузьні вопытнага сьлесара ці мэханіка, загатовіць запчасткі. Можна было стварыць гурток калгасьнікаў па вывучэньні машын. І калі-б шэфская арганізацыя была больш уважлівай да таго, што творыцца ў калгасе, калі-б яна не сушакоілася на веснавых перамогах—падрыхтоўка да ўборкі была-б праведзена значна лепш.

Шэфская арганізацыя заварушылася тады, калі калгасьнікі выехалі на ўборку. Яна пачала прапаноўваць якасьць рамонту машын тады, калі прастой ударылі па выкананьні пэрыяду, калі нормы пачалі выконвацца на 40-50 проц. І, парашыўшы паслаць у дапамогу калгасным кавалём 2-х сьлесараў, выбралі такіх, якія ня ведаюць элементарнага разьліку. Зрабіўшы 4 зубчаткі сьлесары **Касьцяневіч** і **Глаз** замест 30 зубоў у кожнай вытачылі па 31 зубе. Прыйшлося ім на заўтра зноў ехаць у калгас і выпраўляць сваю «памылку».

Калгас «Кастрычніцкая рэвалюцыя» займае 40 проц. усёй плошчы сельсавету. 7 калгасных брыгад працуюць на розных вучастках, пекаторыя з іх на вялікай адлегласьці ад цэнтру, дзе знаходзіцца калгасная кузьня. Зламаныя жнівяркі вязуць у кузьню на рамонт. Гэта арбіраце часта цэлыя дні. Сьлясарны цэх заводу імя Молатава мог-бы арганізаваць адну-дзьве разьвозныя брыгады рамонтных рабочых для халоднага рамонту жнівярак. Гэта з'эканоміла-б шмат каштоўнага часу.

Да пачатку ўборкі аказаліся непадрыхтаванымі ня толькі машыны, але і людзі. 30 ліпеня, у першы дзень уборкі, ня гледзячы на тое, што двор кузьні прадстаўляў сабой сапраўдны могілкі разабраных і нясправных машын, каваці прыступілі да работы ў 8 з паловай гадзін раніцы, а брыгадзір **Міхалевіч** спазьніўся на 3-4 гадзіны. На заўвагу, што пазьніца нельга, яны адказалі: «нам няма куды сьпяшацца». Ніхто ім не растлумачыў, што калі жыта на палёх дасьпявала васковай сьпеласьці — дорага ня толькі кожная гадзіна, але і кожная мінута. А між тым растлумачыць ім гэта —адзін з асноўных абавязкаў шэфа.

Вось яшчэ факт: машыністу брыгады Ратамка-2 тав. **Шэдаву** давалі перадалі пасьля рамонту жнівярку сыстэму «Пэрэгі», а пазьней жнівяркі—сыстэмы **«Макарно».** Пакуль ажлезьліся жнівярка прастаяла гадзіну. Калі прывезьлі другія нажы, яны аказаліся тупымі. А арганізаваць кантроль над работай кузьні—гэта-ж таксама адзін з асноўных абавязкаў шэфа.

Абавязкам шэфа было таксама праверыць, як зашчвяюцца рабочыя кузьні, пабудаваць зарплату так, каб стварыць стымул да ўзьнімаць якасьці рамонту. Гэтага ня было зроблена. Праца дні запісваюцца кавалім нават тады, калі машына пасьля рамонту не працуе, калі той-жа рамонт трэба зрабіць паўторна (так было, напрыклад, з рамонтам жнівяркі «Макарно» для Ваўкоўскай брыгады).

У палявых брыгадах назіраецца рад выпадкаў спазьненьня на работу, сёй-той на работу зусім ня выходзіць (Капырына **Віткоўская,** Мар'я **Лашынская**), сёй-той сьмулюе.

У астатніх 3-х калгасах таксама недахопаў нямала. Прыехаўшыя на ўборку шэфы знайшлі, што яслі не працуюць, масавай і культурнай работы няма—не заменяе п'яцтва, слаба пастаўлен улік працадзён, не разгорнута сацспаборніцтва, ударніцтва і г. д.

Гэтых фактаў ня было-б, калі-б шэфская арганізацыя не прамаргала падрыхтоўкі да ўборкі і не глядзела-б на сваё шэфства, як на абавязак ад адной кампаніі да другой, ад сяўбы да ўборкі.

Зараз шэфбаза заводу імя Молатава імкнецца навярстаць страчанае. Член шэфкуста—апарат ЦК КП(б)Б, які ў часе сяўбы праробіў вялізарную работу, накіраваў у калгас «Кастрычніцкая рэвалюцыя» 6 чалавек. Кожны з іх прымацован да падшэфнай брыгады. Зноў пачаў выходзіць штотэдзенны друкаваны бюлетэнь **«За работу па-новаму»** (пасьля перарыву на ўвесь падрыхтоўны пэрыяд да ўборкі). Адкуль яноць свой выхад і брыгадныя пасьцягазеты. Для барацьбы з прагуламі і спазьненьнямі створан таварыскі суд. У калгас **«Чырвоны араты»** паслан кіраўнік ясьлей. Паслан рахункавод. Праверан стан пажарнага інвэнтару. Выкіджаў драмгурток.

Але ня так лёгка навярстаць страчанае. Праз адзінаццаць дні падшэфны сельсавет скончыць уборку жыта. Трэба неадкладна пераключыцца на малацьбу. А з 16-ці простых малатарань у калгасе «Кастрычніцкая рэвалюцыя» ні адна не адлоджана, не праверана. Многія адчуваюць патрэбу ў тэрміновым рамонце. Дапускаецца ў малатарні адрамантавана (у ёй ня хапала раду частак), але якасьць рамонту не праверана.

Не падрыхтаваны склады для ссыпкі збожжа. З 7-мі складаў 3-4 патрабуюць рамонту. І зараз, у самы разгар уборкі, трэба адрываць людзей на рамонт складаў.

Не падрыхтавана тара. Не хапае каля 115 мяшкоў. Думаюць сабраць іх сярод калгасьнікаў, але да гэтай справы яшчэ не прыступілі. Чагосьці чакаюць.

Мала зроблена для аховы ўраджаю. Аб'ектыўкі, вартаўнікі вылучаны. Але шэф у гэтай рабоце ўдзелу ня прымае праверыў — ні людзей, ні расстаноўкі іх, ні якасьці аховы.

А тав. **Екельчык,** сакратар парт'ячэйкі сьлесарнага цэху заводу імя Молатава, прымацаванага да калгасу «Чырвоны араты», заявіў, што «наконт аховы ўраджаю мы яшчэ нічога не зрабілі».

Дрэнна працуе калгасная сталоўка. Ня гледзячы на падшэфнасьць прадуктаў, якасьць абедаў вельмі нізкая (заг. сталоўкі—**Ляўковіч**)

Партыйная работа ў сельсавеце не перабудавана. Ячэйкі ў калгасах ня створаны. Ці правільна расстаўлены партыйныя і камсамольскія сілы? Гэта трэба праверыць, абмяркаваць.

У сельсавеце ёсьць група пастаўшыкаў, сярод іх камсамольцы **Рузаў** і **Працэнкава.** Абодвы зьявіліся з вучоты, гаворачы, што ад'язджаюць, на самай жа справе сядзяць у Радамцы, а з вучоты зьявіліся, каб іх не тупдавалі. Заг. школай тав. **Мілешка** таксама стаіць у баку ад усіх пытаньняў уборачнай кампаніі.

У шэфбазу ўваходзіць яшчэ рад арганізацый: інстытут камвыхаваньня, амбулаторыя Кажароўкі, Белдрэў, паўпаркамол, сакратурная арцель мэталістаў і інш. Некаторыя з іх (як інстытут камвыхаваньня, арцель і інш.) прымаюць вельмі слабы ўдзел у шэфскай рабоце. Сакратар парт'ячэйкі сьлесарнага цэху тав. **Екельчык** нават ня ведае ўсіх членаў базы, якія шэфствуюць разам з цэхам над калгасам «Чырвоны араты».

—Уваходзіць,—гаворыць ён. — яшчэ нейкая арцель мэталістаў...

Ён нават не падумаў, што арцель мэталістаў можа прынесьці нямала карысьці сельсавету, дапамагаючы рамантаваць машыны і інвэнтар.

Партыйнае і прафсаюзнае кіраўніцтва шэфбазай слабае. Сакратар партколектыву заводу тав. **Дашукевіч** працуе на заводзе ўсяго 2 месяцы—ні разу яшчэ ня быў у падшэфным сельсавеце. Адрываецца недахватам часу. Старшыня заўкому—новы, яшчэ не пасьпеў агледзецца.

Такім чынам, шэфбаза заводу імя Молатава, маючы сярод сваіх членаў такую актыўную і моцную арганізацыю, як апарат ЦК КП(б)Б, маючы багацейшы вопыт шэфскай работы ў часе веснавой сяўбы, ня здолела забясьпечыць выразнай падрыхтоўкі свайго падшэфнага сельсавету да ўборкі ўраджаю. Навярстаць страчанае цяжка, але зусім магчыма. Жаданьне ў кіраўніцтва шэфбазы ёсьць. Трэба толькі мабілізаваць усю рабочую масу заводу, усе калектывы членаў шэфбазы, распрацаваць канкрэтны плян дзённай і ахапіць сваім уплыв

Германска-аўстрыйскі канфлікт

Чарговы інцыдэнт на аўстра-германскай граніцы

ВЕНА, 13. (Белта). У раёне аўстрыйскага пагранічнага з Германіяй мястэчка **Клебэнштэйн** у аўстрыйскую пагранічную варту германскія нацыянал-сацыялісты зрабілі 30 стрэлаў і абстрэлялі склады амуніцыі. Аўстрыйскі міністар бясьпечнасьці Фэй прадпрыняў інспэкцыйную паездку на граніцу. У **Зальцбургу** Фэй заявіў, што калі тэрарыстычныя дзеяньні нацыянал-сацыялістаў ня спыняцца, дык у Аўстрыі будзе ўведзена кара сьмерцю і створаны лягары для тых, хто робіць «даяржаўную здраду».

***

ВЕНА, 13. (Белта). У **Вінэрнэйштадце** (прамысловы горад каля Вены) у аўтамабілі аднаго нацыянал-сацыяліста паліцыяй выяўлена 13 пяхотных мінаў, прызначаных для ўзрыву буйных аб'ектаў. Два нацыянал-сацыялісты арыштаваны.

Мюнхэнскае радыё па-ранейшаму перадае антыаўстрыйскія прамовы. З такімі прамовамі выступілі два высланыя з Аўстрыі германскія журналісты.

Гітлераўская агітацыя ў Румыніі

ВЕНА, 14. (Белта). Агенты германскіх нацыянал-сацыялістаў у нямецкіх раёнах **Румыніі** разгарнулі агітацыю ў **Семігрэдзэі, Буковіне,** а таксама сярод нямецкіх калёністаў паўднёвай **Бэсарабіі** і сярод кулацкіх пластоў вёскі, скарыстоўваючы з дэмагогічнаю мэтаю нездавальненьне зьбяднелых у рэзультаце крызісу сялянскіх мас. У горадзе **Сібіу,** дзе дакладчыкамі сходаў нямецкай нацыянал-сацыялістцкай арганізацыі выступілі дэлегаты германскіх нацыянал-сацыялістаў, прысутнічаў, згодна паведамленьня «Дыгінэцца» германскі пасланьнік у Бухарэсьце **Шуленбэрг.**

Выключэньне германскіх дэлегатаў з міжнароднага кангрэсу настаўнікаў

ПАРЫЖ, 13. (Белта). У Сантандэры (Гішпанія) па міжнародным кангрэсе рэфармісцкага прафсаюзу асьветнікаў прадстаўнік аўстрыйскага прафсаюзу, заявіў, што ён ня зьлічыць магчымым супрацоўнічаць з «немцамі», бо «Германія прасьледуе Аўстрыю». Германскія дэлегаты дэманстрацыйна пакінулі залю. Большасьцю 40 супроць 21 пастаноўлена не дапускаць на кангрэс германскіх дэлегатаў, пакінуць незанятымі месцы германскіх працаўнікоў у міжнародным аб'яднаньні саюзу, пакуль у германскім прафруху ня зьменіцца становішча.

Масавая аблава ў ваколіцах Бэрліну

БЭРЛІН, 14. (Белта). У ноч на 12-е жніўня у пошуках пашыраючай камуністычнай лістоўкі, у ваколіцах **БЭРЛІНА** праведзена аблава. Абшуканы ўсе аўтамабілі, грузавікі, матацыклы, велёсыпэдысты, павозкі з прадуктамі і г. д., якія накіроўваліся ў Бэрлін і выхлі з Бэрліну.

У **ШТУТГАРЦЕ** арыштован былы камдэпутат ляндтагу **ФІШАР** і рад асоб, якія падазраваліся ў падтрыманьні сувязі з Фішэрам. Недалёка ад Магдэбургу «пры спробе ўцякаць» застрэлен камуніст **ВЭІС.**

Апублікавана паведамленьне аб тым, што нібыта раскрыта тайная камуністычная друкарня. Указваецца, што ў **ПОТСДАМЕ** затрыман аўтамабіль з транспартам прызначаных для правінцыі камуністычных лістовак. Арыштован суправаджаўшы транспарт камуніст Лістоўкі знаходзіліся ў картонных каробках магазыну касьцюмаў, у якім арыштаваны 4 служачых, абвінавачаных у друкаваньні лістовак.

***

БЭРЛІН, 13. (Белта). Паведамляюць, што з 15-га верасьня па 1-е лістапада лідэры і агітатары фашысцкіх уніфікаваных прафсаюзаў («Рабочы фронт») правядуць на прадпрыемствах вярбовачную кампанію пад лозунгам стварэньня атмасфэры «давер'я паміж рабочымі і прадпрыемцамі».

Новае паведамленьне аб працэсе Вандэр-Любэ

БЭРЛІН, 14. (Белта). Агенцтва «ТЭЛЬ УНІОН» паведамляе, што суд над абвінавачанымі ў падпале рэйхстагу адбудзецца не раней канца верасьня.

Скарачэньне вытворчасьці ў Германіі

БЭРЛІН, 13 (Белта). З набліжэньнем канца летняга сезону афіцыяльна канстатуемае «ажыўленьне» прамысловасьці зьнікае. Загрузка тэкстыльнай прамысловасьці пасьля пажрыцьця кагрэб касьці ў форменнай вопратцы для фашысцкіх арганізацый, зноў зьнізілася. Адсутнасьць заказаў вымусіла большасьць прадпрыемцаў пашыраваць, дрэвапрацоўчай і картанажнай прамысловасьці значна зьнізіць вытворчасьць. На гранцовым рынку апошнія тыдні поўная адсутнасьць выдзелак. Вялікую трывогу аграрыяў выклікае падзеньне цэн на жыта з 150 марак за тону ў пачатку чэрвеня да 140 марак на 10 жніўня.

Дэманстрацыі і разгром прэзыдэнцкага палацу на Кубе

Прэзыдэнт Мачадо падаў у адстаўку

НЮ-ЁРК, 13 (Белта). Згодна паведамленьня з **ГАВАНЫ,** прэзыдэнт Кубы **МАЧАДО** падаў у адстаўку і выляцеў у ангельскую калёнію на Багамскія астравы. У рэзультаце нарады пасла **ПАЗШ** з лідэрамі прыслугоўваючых амэрыканскаму імпэрыялізму кубінскіх буржуазных партый, часовым прэзыдэнтам назначан былы кубінскі пасланьнік у Вашынгтоне СЭПЭДЭС. У часе нарады вялізарныя натоўпы рабочых, студэнтаў і дробнай буржуазіі дэманстравалі, вітаючы адрачэньне Мачадо. Дэманстранты падпалілі кантору газэты Мачадо, разграмілі частку прэзыдэнцкага палацу, забілі начальніка, а таксама 30 агентаў тайнай паліцыі, у тым ліку Магрыне, вінаватага ў забойстве кубінскага камуніста Мэлва, і спалілі дамы некаторых членаў ураду Мачадо. Зносіны з правінцыянальнымі гарадамі Кубы прыпынены.

Сацыял-рэфармісты сарвалі забастоўку салідарнасьці ў Страсбургу

ПАРЫЖ, 13. (Белта). Як паведамляюць з **СТРАСБУРГУ,** у рэзультаце манэўраў згодніцкім лідэрам удалося сарваць стачку салідарнасьці работнікаў трамваю. Пасьля гэтага спынілася стачка ў металяпрамысловасьці, а таксама ў півавараным прамысловасьці.

Агенцтва «Гавас» перадае аб тым, што варочаюцца на работу муніцыпальныя работнікі-табачнікі. Унітарная канфэдэрацыя працы апублікавала паведамленьне аб тым, што ў рэзультаце спыненьня стачкі салідарнасьці трамвайшчыкаў, рабочыя іншых галін, баставаўшыя ў знак салідарнасьці з будаўнікамі, таксама вернуцца на работу 13 жніўня. 1500 бастуючых будаўнікоў пастанавілі працягваць стачку. Бляшанкі таксама працягваюць баставаць.

Пасьля спыненьня забастоўкі салідарнасьці работнікаў трамваю, прадпрыемцы, заахвочаныя здрадніцтвам рэфармісцкіх лідэраў, рашуча адмовіліся задаволіць патрабаваньні бастуючых будаўнікоў, і стараюцца зацягнуць перагаворы. У **МЮЛЬГАЎЗЭНЕ РАБОЧЫЯ РАДУ ПАБУДОЎ ПАСТАНАВІЛІ АБВЯСЬЦІЦЬ 16-ГА ЖНІЎНЯ ЎСЕАГУЛЬНУЮ ЗАБАСТОЎКУ.**

Жахлівае становішча беспрацоўных у Польшчы

ВАРШАВА, 14 (Белта) Выпушчаная інстытутам сацыяльных навук кніга аб беспрацоўі ў Польшчы канстатуе, што на 100 сем'яў беспрацоўных прыходзіць па 37 дзяцей. 24 проц. дзяцей беспрацоўных ідуць у школу бяз сьнеданьня. На 100 дзяцей прыходзіцца 38 пальто і 65 пар абутку. У Озэркове (Лодзінскі раён) 7 проц. беспрацоўных жаўчыць чэрвякоў ды жыцьця прастытуцыяй.

Клясавая барацьба ў краінах капіталу

ЧЭХАСЛАВАКІЯ. Надзвычайным дэкрэтам з 15-га верасьня разьмер дапамог па беспрацоўі зьніжан у сярэднім на 30 проц. і значна абмежавана права атрыманьня дапамогі. Згодна разьлікаў ураду, гэта «дасьць эканоміі» штогод 250 млн. крон. У пісьце да прэзыдыюму парлямэнту камфракцыя патрабуе неадкладнага скліканьня парлямэнту для абмеркаваньня скасаваньня дэкрэту.

ГРЭЦЫЯ. На востраве Эўбэя гарнякі капальнёў бурага вугалю накіраваліся да шахтакіраўніцтва патрабаваць выдачы затрыманай за 7 месяцаў зарплаты. Жандармэрыя страляла ў гарнякоў. Паранена звыш 20 чал, з іх 6 цяжка.

ПАЗШ. Некалькі тысяч гарнякоў у штаце **ПЭНСІЛЬВАНІЯ** працягваюць баставаць наперакор згодзе прафбюракратаў з прадпрыемцамі аб скарачэньні забастоўкі.

ЭСТОНІЯ. Пад прадлогам барацьбы з фашысцкай агітацыяй эстонскі ўрад увёў ваеннае становішча, астрыё якога накіравана супроць рэвалюцыйнага рабочага руху. Начальнікам унутранай абароны назначан генэрал Іонсон. Забаронен фашысцкі саюз вэтэранаў вайны і арганізаваныя фашыстамі «легіёны паўночных палярнічых». Цэнтральны орган саюзу вэтэранаў «АНТЛІС» канфіскован.

КІТАЙ. У Шанхаі тры тысячы забаставаўшых рабочых англа-амэрыканскай тытуневай кампаніі занялі і адмовіліся аслабаніць будынак аднэй фабрыкі. Адміністрацыя, зачыніўшы вокны і дзьверы, пусьціла гарачую пару. На гледзячы на нявыносную гарачыню, рабочыя засталіся і адміністрацыя вымушана была спыніць пуск пары.

Кітайскімі ўладамі ў Цяньцзіне арыштавана рота спэцыяльнай паліцыі каля 100 чалавек, якія абвінавачваюцца ў «стварэньні смуты» ў іншых ротах і ў прад'яўленьні патрабаваньняў павялічыць пэнсію.

Эканамічная экспансыя Японіі ў Кітаі

ШАНХАЙ, 14 (Белта). У парты цэнтральнага Кітаю ўвезена ў ліпені 2 328 тон японскіх тавараў, супроць 510 тон у чэрвені. «Чайна Таймс» падкрэсьлівае, што японцы энэргічна пашыраюць свой гандаль па ўсёй даліне рэкі Янцзы. У паўночным Кітаі, паводле вестак «Сымбун Рэнго», аднавіўся байкатыцкі рух.

У **Цяньцзіне** нядаўна канфіскавана партыя японскіх бавоўняных тканін. Японскі консул заявіў рашучы пратэст, патрабуючы звароту канфіскаваных тавараў.

Прыезд Эрыё у Балгарыю

ВЕНА, 13 (Белта). Як паведамляюць з **Сафіі,** там адкрыўся міжнародны кангрэс «дэмакратычных» і «радыкальных» партый. Удзельнічаюць 75 дэлегатаў, у тым ліку 50 балгарскіх і 25 замежных. Для ўдзелу ў кангрэсе прыбыў **Эрыё.** Насустрач яму выехаў на балгарскую граніцу прэм'ер Мушанаў. На Сафійскім вакзале Эрыё быў сустрэтан габінэтам міністраў у поўным складзе. Эрыё выбран ганаровым грамадзянінам Сафіі. Увесь балгарскі друк прысьвячае Эрыё прывітальныя артыкулы. Некаторыя з іх надрукаваны на французкай мове.

Паглыбленьне эканамічнага крызісу ў Польшчы

Эканамічны крызіс усё больш паралізуе ўсё гаспадарчае жыцьцё Польшчы. Польская прэса кожны дзень паведамляе аб усё новых зачыненьнях фабрык і заводаў, аб спыненьні працы рэдуг вугальных капальняў у Верхняй Сілезіі, Дамброўскім і Кракаўскім басэйнах. Сельская гаспадарка амаль поўнасьцю зруйнавана.

З году ў год павялічваецца бюджэтны дэфіцыт. У 1933 годзе бюджэтны дэфіцыт у красавіку выявіўся ў 15.6 мільёнаў злотых, у маі — 24,5 мільёны і ў чэрвені — 24 мільёны. Паводле падліку друку дэфіцыт да канца году дасягне 300 мільёнаў злотых.

Таксама скарачаюцца замежны гандаль. Паводле даных статыстыкі імпарт за першае паўгодзьдзе 1933 году ў параўнаньні з 1931 годам зьменшыўся на 53 проц. і экспарт на 94 проц.

Прыбыткі ад чыгункі бязупынна зьмяншаюцца. «Роботнік» піша, што прыбытакаў ад чыгункі за першы квартал 1933 году ня хопіць нават на пакрыцьцё выдаткаў. Дэфіцыт за першы квартал 1933 году складае 4 мільёны злотых.

Упадак прыбыткаў ад чыгункі характарызуюць наступныя лічбы: за першы квартал 1931 году прыбыткі складалі суму ў 306 мільёнаў злотых, у 1932 годзе — 238 мільёнаў злотых, а ў 1933 годзе — 201 мільён злотых.

Замежная хроніка

* Паводле даных міністэрства ангельскага замежнага гандлю, за мінулыя 7 месяцаў, у параўнаньні з адпаведным перыядам 1932 году, імпарт Англіі зьменшыўся амаль на 39 млн. фунтаў, экспарт на 14,25 млн.

* У Марока разьбіліся два французкіх ваенных самалёты. Экіпаж загінуў.

* У Італію прыбыла эскадрыльля гідраплянаў, якая зрабіла трансатлянтычны пералёт.

* У сувязі з высылкай з Турцыі **Лендэра** — прадстаўніка фірмы «Армстронг Вікерс», фірма заяўляе ў друку, што Лендэр выступаў у якасьці яе агента, але «не знаходзіцца ў штаце». Тое, што адбылося ў яго з турэцкім урадам, зьяўляецца «яго чыста прыватнай справаю».

* Пры выпрабаваньні на супрацьпаленьня гандолы стратастату аськстантам прафэсара Піхара выбухнуў узрыў. Адзін рабочы забіт, адзін цяжка паранен. Канструктар і адзін рабочы лёгка паранены. Як паведамляюць, канструктар рабіў выпрабаваньне на сваю рызыку, таму што Коэзнэр адмовіўся рабіць выпрабаваньні і патрабаваў замены гандолы з прычыны выяўленых у ёй сур'ёзных дэфэктаў.

Недапушчальнае ігнараваньне важнейшага мерапрыемства

На пастанове ЦК УсеЛКСМ з 1 жніўня па 15 верасьня абвешчан 3-ці ўсесаюзны рэйд «лёгкай кавалерыі» на праверку татоўнасьці прыгарадных гаспадарак да ўборкі ўраджаю гародніны. Няма патрэбы даказваць тэй выключнай важнасьці, якую набывае гэты рэйд у справе выкананьня пастановы партыі і ўраду аб максымальнай мабілізацыі ўсіх сіл на паспяховае і высокаякаснае правядзеньне ўборкі гародніны.

Недарма на аказаньне канкрэтнай практычнай дапамогі калгасамоцу ў травядзеньні гэтага рэйду была зьвернута сур'ёзная ўвага ў лісьце ад 1 жніўня старшыні ЦКК УсеКП(б) тав. Рудзутака, нам. Наркамзэмпраму СССР тав. Пятроўскага, пракуратуры СССР. Цэнтрасаюзу і раду другіх вышэйшых органаў.

Здавалася-б, што на гэта важнейшае мерапрыемства і ўказаньне кіруючых саюзных органаў гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі «БССР па вёсны былі зьвярнуць сур'ёзную ўвагу і прыняць у гэтым рэйдзе практычны ўдзел.

Аднак, ня гледзячы на тое, што з дня абвешчаньня рэйду прайшло поўмесяца, многія арганізацыі пальцам аб палец не ўдарылі для аказаньня канкрэтнай дапамогі ў правядзеньні рэйду. Чым, калі не недаацэнкай гэтага мерапрыемства можна кваліфікаваць такія бястурботныя, благадушныя адносіны раду кіраўнічоў арганізацый?

Яркім фактам, які пацьвярджае нежаданьне прымаць удзел у рэйдзе, можа служыць наступнае: на скліканую ЦК ЛКСМБ нараду па пытаньні аб рэйдзе такія арганізацыі, як **Наркамцяжпрам, Наркамлёгпрам, Дзяржплан, Белкаапсаюз, Белкаапсадгародніна, Наркамснаб, ЦП прафсаюзаў швэйнікаў, мэталістаў, дрэваапрацоўшчыкаў, Дзяржгандлю і каапэрацыі** не палічылі патрэбным прысылаць сваіх прадстаўнікоў. Кваліфікуючы такія адносіны, як зьлую недаацэнку рэйду, а значыцца й недаацэнку падрыхтоўкі да ўборкі ўраджаю і гародніны, просім адпаведныя арганізацыі прыняць неабходныя меры.

Апэрацыйная тройка па правядзеньні рэйду «ЛК» пры ЦК ЛКСМБ.

Апошнія прыгатаваньні да палёту ў стратасфэру

ЛЕНІНГРАД, 14. (Белта). Заканчваецца мантаж і ўстаноўка прылад гандолы першага савецкага стратастату. Большасьць прылад для навуковых работ зроблена на савецкіх заводах. Некаторыя прылады — адзіныя ў сьвеце. Яны прызначаны галоўным чынам для вывучэньня касьмічных праменьняў і былі зроблены пад кіраўніцтвам аднаго з буйнейшых спэцыялістаў, радыё-інстытуту праф **Вэрыга.** Пад непасрэдным кіраўніцтвам акадэміка Іофэ зроблена спэцыяльная прылада тыпу так званай «камэры Вільсона», але значна спрошчаная. Яна дае магчымасьць рабіць больш паглыбленыя дасьледваньні, чым апаратура Піхара. Распрацована прылада спэцыяльнай канструкцыі для дасьледваньня хэмічнага складу паветра. Для вывучэньня магнэсавага поля скансструяваны таксама спэцыяльныя прылады. З вонкавым сьветам гандола будзе ўвесь час зьвязана пры дапамозе радыёстанцыі.

Менгарком КП(б)Б паведамляе, што прызначаны на 13-VIII-1933 г. агульнагарадзкі сход партактыву, прысьвечаны 30-годзьдзю другога зьезду партыі, **пераносіцца на сёньня** у 7 гадзін увеч. у летнім тэатры (сад «Прафінтэрн»).

Узятыя білеты на партактыў на 13-VIII сапраўдны і на 15-VIII г.г.

Сакратары ячэек і парткалектыў, якія неатрымалі білеты на партактыў, павінны атрымаць 14-VIII і 15-VIII у ГК КП(б)Б, пакой № 46 з 10 да 4 гадзін дня.

Менгарком КП(б)Б.

У МЕНСКУ АРГАНІЗУЕЦЦА ЦЭНТРАЛЬНЫ БАТАНІЧНЫ САД

Беларускай Акадэміяй Навук на працягу двух год вядзецца работа па арганізацыі цэнтральнага батанічнага саду. Спэцыяльнай конкурснай камісіяй у Маскве пры самым шырокім удзеле Ленінградзкага Батанічнага інстытуту ўжо распрацован праэкт разьбіўкі саду. Канчатковае архітэктурнае афармленьне саду зроблена беларускім архітэктарам ЛАЎРОВЫМ.

Акадэміяй Навук Беларусі складзен пяцігадовы плян арганізацыйнай і навукова-дасьледчай работы саду. У ажыцьцяўленьне гэтага пляну ў садзе ўжо арганізаваны сэктары гадоўлі расьлін, біялёгічны, эвалюцыйны, Заходня-Эўрапэйскі, Паўночна-Амэрыканскі, Усходня-Азіяцкі, Сярэдня-Азіяцкі і аддзелы дэндралёгіі, флёры БССР і РСФСР, а таксама сэктар спэцыяльных дасьледваньняў.

З пачатку 1933 году навуковыя работнікі саду ў шырокім маштабе разгарнулі работу па аддзелах жывых расьлін, дэндралёгіі і гэрбарыя флёры БССР. Толькі па аддзелу жывых расьлін вясною гэтага году засеяна каля трох тысяч розных траў — аднаклетачных і шматклетачных і 800 відаў дрэваў і хмызьняку па аддзелу дэндралёгіі.

Адначасова зроблена закладка біялёгічнага сэктару і пасадка дравесных парод у сэктарох флёры БССР, Усходняй Азіі і Паўночнай Амэрыкі.

Што датычыць астатніх сэктароў, дык для іх пасадачны матар'ял зараз вырошчваецца ў спэцыяльных пітомніках-школах, парнікох і цяплёцах.

Вялікая работа праводзіцца сёлета яшчэ па аддзелах гэрбарыя і музэя. Вынікі дасьледваньня па гэтых аддзелах у бліжэйшыя дзе гады мяркуецца апрацаваць і выдаць, як спэцыяльны навуковы дапаможнік па расьлінах флёры БССР. Да апрацоўкі пасобных частак гэтага дапаможніка прыцягнуты выдатныя спэцыялісты, акадэмікі Саюзу і Украіны.

Асноўным зьвяном навукова-дасьледчай работы саду, на даным этапе зьяўляецца нагляд над разьвіцьцём высаджаных і высеяных расьлін і досьледы над акліматызацыяй чужаземных відаў.

У прыватнасьці вывучаюцца травяныя віды, прыгодныя для ўжываньня, як новыя кармовыя і культурныя расьліны. Дасьледваюцца новыя культуры для пасаразьвядзеньня і зялёнага будаўніцтва гарадоў.

Вялікай увагі заслугоўвае работа, якая праводзіцца зараз садам па вывучэньні соі — зусім новай ва ўмовах БССР расьліны, і новых гатункаў бульбы, атрыманай у вялікай колькасьці з Амэрыкі. Апошняя вывучаецца з пункту гледжаньня захоўваньня яе ад грыбных захворваньняў.

Зараз перад цэнтральным батанічным садам паўстала неадкладная задача па наладжаньню аранжэрэйнай справы. Рад праэктаў па будаўніцтву аранжэрэяў спэцыяльнай камісіяй БАН ужо распрацаваны і перададзены масквоўскім спэцыялістам для больш дэтальнай распрацоўкі і складаньня на іх аснове закончанага пляну аранжэрэйнага будаўніцтва.

Буйнейшыя работы па арганізацыі аранжэрэяў мяркуецца распачаць у гэтым годзе.

Па віне Наркамасьветы зрываецца забесьпячэньне школ абсталяваньнем

Віцебская інструмэнтальна-мэблевая фабрыка мае заказ ад НКАсьветы на выраб 3.000 школьных парт, 200 шафаў, і 1.000 клясных дошак. Фабрыка пасьпяхова спраўляецца з выкананьнем гэтага заданьня. Але гатовая прадукцыя не адгружаецца. Напрыклад, Віцебскі райАНА з заказаных 2.000 сталоў забраў 800, Магілёўскі райАНА з 900 забраў 300 і г. д. Гэта становішча тармозіць далейшую работу фабрыкі.

Лепш ў горшым становішчы дрэваапрацоўчы завод імя Молатава ў Барысаве, які згодна заказу НКАсьветы зрабіў 3.500 школьных парт. **Гатовая прадукцыя НКАсьветы ня выкуплена.**

І гэта ў той час, калі з рабкаў паступаюць запытаньні аб тым, дзе заказаць школьную мэбліо (Слаўцкая школа Касьцюковіцкага раёну).

Такое становішча стварылася з тэй прычыны, што **НКАсьветы ня даў асыгновак райАНА на выкуп мэблі і ўказаньняў аб неадкладнай адгрузцы.**

Паведамленьні

16 жніўня г. г. о 3 гадзіне дня ў рэдакцыі газэты «Зьвязда» (Савецкая, 63, 3-і паверх, пакой прамсэктару) АДБУДЗЕЦЦА ПАСЯДЖЭНЬНЕ ЦЭНТРАЛЬНАГА ШТАБУ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ ЎСЕСАЮЗНАГА СУПРОЦЬПАЖАРНАГА РЭЙДУ.

На пасяджэньні будуць разгледжаны пытаньні аб ходзе рэйду па БССР (даклад Наркамунгас Беларусі), дакл. Наркамзему і Упаўнаркамсаўгасаў аб іх рабоце па арганізацыі супроцьпажарнай аховы ў саўгасах, калгасах і МТС. Апрача таго даклад аб ходзе супроцьпажарнага рэйду па МЕНСКІМ РАЁНЕ.

На пасяджэньне апрача членаў штабу запрашаюцца: адказныя прадстаўнікі ЦКК НК РСІ, УПАЎНАРКАМСАЎГАСАЎ, НАРКАМЗЕМУ, ТРАКТАРАЦЭНТРАЎ, НАРКАМФІНУ, ЦП САЮЗУ КАМУНАЛЬНІКАЎ, дырэктар Белкамунбанку РАЗЭНГАЎЗ і начальнік пажарнай аховы Менскага раёну КАЗАЧОНАК.

Просьба да ўсіх т. т., якія выклікаюцца на пасяджэньне, прыбыць з адпаведнымі матар'ялам.

ЦЭНТРАЛЬНЫ ШТАБ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ СУПРОЦЬПАЖАРНАГА РЭЙДУ ПРЫ РЭД. ГАЗ. «ЗЬВЯЗДА».

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 19 жніўня 1933 году адбудзецца пасяджэньне ПК ЦКК КП(б)Б на разгляду наступных партсправаў:

Райхлін М. М., Янель К., Буевіч А. А., Лось М. В., Татус А. П., Марыскін Р. М., Дзеравенскі Н. А., Асіповіч В. Ф., Кулешоў, Афанасьеў С. І., Агеєў, Кавалёў Я. В., Арцюхоў А. Л., Янум Э. Г., Арлоў М. В., Тамароніч В. І., Вялярскі М. М., Шонец М. П., Рабчынскі Д. А., Квасьніцкі М. С., Шэйпак А. С., Стапчэўскі В. П., Пташкоў І. А., Пятапейка К. А., Кухараў А. Я., Савельлёў Ц. Д., Юрчанка С. Ю., Жураўлёў А. К., Пятроў М. В., Якіменка А. А., Філіпаў М. П., Мядзьведзеў Ул. І., Шкуратаў С. М., Шкуратаў Я. Ф., Фінашуцін А. М., Малішоўскі Х. Х., Андрэенкаў М. З. Справа Гіжанскага вучастку Прапойскага лесгамгасу (выклікаецца тав. Кавернік і пракурор Прапойскага раёну).

Прысутнасьць выкліканых таварышоў абавязкова. Да дня разгляду справы неабходна прадстаўленьне імі характарыстык ад парт'ячэйкі аб іх апошняй рабоце.

Праезд за свой кошт.

Член ПК ЦКК КП(б)Б СЬЦЯПНЯК.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Гарадзкі сад
ДЗЯРЖЦЫРК
—ШАПІТО.
СЁНЬНЯ І ШТОДЗЕННА
АБНОЎЛЕНАЯ ПРАГРАМА
НОВАЕ ВІДОВІШЧА СЬВЕТ ЖЫВЁЛЫ—
ЗАКАЗНЫЯ ТАБЛО, зебры, ламы, цэбы, дзікі, драмадэры.
Германская дрэсіроўшчыца МАРГАРЫТА БАРУМ
Першае выступленьне ЛЕО РУЖАНСКАГА—комік-эксцэнтрык.
Трымаюць удзел лепшыя сілы савецкіх і замежных цыркаў.
ВЯСЁЛЫЯ КАЧАРЫ—тры маркі танцоры.
Папулярны артыст Саюзу ССР ЛЕАНІД ІВАНОЎ і яго новай групай дрэсіраваных коняй нямецкага цырку.
4—ДЖЫОВАНІ — палёт у паветры.
ДАЖІРАЎ і ГУРСКІ—надзённая паліт-сатыра.
У праграме нумары розгнага жанру. Вялікая група дрэсіраваных коняй нямецкага цырку.
ПАЧАТАК у 9 гадзін вечара.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Касы—ад 1 г. дня.
„ПРАЛЕТАРЫ" Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз. веч.
Мазнухін і Лісэнка у фільме „АЙЦЕЦ СЕРГІ"
ІНТУРБАНЦЫЯНАЛ
Мастацкі фільм ЧАЛАВЕК в РЭСТАРАНУ (зусім новы экзэмпляр)
„СПАРТАК" Касы—з 3 г. 30 м.
Ігор Ільінскі ў фільме Сьвята сьв. Іоргена Весёлая камэдыя ў 7 част.

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ
зэіко-тэатр
ГЭТЫМІ ДНЯМІ!
ДЗЯДЗЬКІ
ХАЦІНА ТОМА

МЕНСКІ ГІДРАТЭХНІКУМ
ПАВЕДАМЛЯЕ, што
ІСПЫТЫ
для падаўшых заяў аб залічэньні ў тэхнікум пачнуцца 16-га жніўня роўна ў 9 гадз. раніцы ў памяшканьні тэхнікуму (Дрэваапрацоўчая вул № 59/17а).
Усе падаўшыя заявы павінны зьявіцца ў паказаны час на Іспыты. Асобна, якія не дапушчаны да Іспытаў, паслана пэрсанальнае паведамленьне.
Прыём заяў ад жадаючых паступіць у тэхнікум адбываецца да 20-га жніўня.
Дырэкцыя.

Менскі плодагародны трэст даводзіць да ведама ўсіх саўгасаў, калгасаў, калгаснікаў і адноасобнікаў Менскага раёну, што з 10 жніўня г.г. прыступлена да засолкі агуркоў.
АГУРКІ, як цэнтралізаваныя, так і дэцэнтралізаваныя ПРЫМАЮЦЦА на заводзе № 1 у Менску, Малая Татарская, 34 і засолпуніце № 2 у мястэчку Самахвалавічы.
Прадукцыя прымаецца выключна добрайякасная.
Дырэкцыя.

Хэміка-тэхналёгічны факультэт палітэхнічнага інстытуту
прапануе ўсім студэнтам II, III, IV, V і VI груп былога інстытуту харчовай прамысловасьці ў Менску
ЗЬЯВІЦЦА ў канцылярыю факультэту 20-га жніўня 1933 г. у 10 гадз. раніцы.
Факультэт знаходзіцца ў памяшканьні былога хэміка-тэхналёгічнага інстытуту, Замкавэрбскі зав. 4.
ДЭКАНАТ.

ІКПТ СССР „БУРВОДТРЭСТ"
Гомельскае аддзяленьне па БССР і Заходняй вобласьці ўсесаюзнага дзяржаўнага буравога трэсту
ПРЫМАЕ ЗАЯЎКІ
на III—IV кварталы 1933 г. на БУРЭНЬНЕ АРТЭЗЬЯНСКІХ СТУДНЯЎ.
У заяўках неабходна ўказаць наступнае:
1. Адрас работ (чыг. ст. і адлегласьць ад яе да месца работы).
2. Патрабуемая часовая прадукцыя насьць артэзьвідравіны.
Пажадана адмеціць вышыні месца за кладу сьвідравіны. Таксама пажадана прыкласьці да заяўкі заключэньні гідрагеолёгаў, калі такія ёсьць.
Работы праводзяцца круглы год.
Заяўкі накіроўваць: г. Гомель, вул. Леніна, 18, гомельская кантора Бурводтрэст.

Да ведама ўсіх авансатоымальнікаў!
Менская Міжраённая база БЕЛГАНДЛЮ абвяшчае, што
АПОШНІ ТЭРМІН прад'яўленьня талёнаў
на атрыманьне камэрцыйных тавараў устаноўлен да 25-га жніўня г. г.
Тавары для атрыманьня па гэтых авансавых талёнах ёсьць у магазыне № 22 па Савецкай вул., дом № 62. Магазын працуе з 10 гадз. раніцы да 6 гадзін веч. Ёсьць дэфэрэнцыт тавараў у мястэчкавай колькасьці: мануфактура, абутак, шалёшы, гатовае адзеньне, трыкатаж і інш. тавары.
Пасьля гэтага тэрміну грошы па не прад'яўленых талёнах авансатары мальнікаў будуць перададзены ў дэпазыт эшчэдкасы.
ДЫРЭКЦЫЯ.

РАБФАК
ПАЛІТЭХНІЧНАГА ІНСТЫТУТУ
абвяшчае, што прыём заяў
ПРАЦЯГНУТ да 25-га жніўня 1933 г.
Аб часе Іспытаў будзе паведамлена асобна.
Паступаючым на ўсе курсы навучэньня аддзял. Рабфаку (беларускай і ўкраінскай сэкцыяй) будзе аказана дапамога на падрыхтоўцы да Іспытаў шляхам арганізацыі кароткатэрміновых курсаў з 16 на 30 жніўня г.г. з 7 гадз. вечара.
Адрас: Менск, Чырвонаармейская, 16, пакой 24.
Дэканат Рабфаку.

Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі
Сэктар кнігагандлю
Літаратура
да Ўсесаюзнага дня авіяцыі—18 жніўня
ЗА МОЦНЫ САВЕЦКІ ПАВЕТРАНЫ ФЛЁТ!
КНЯЗЕЎ Ф. Камсамол, на самалёт! 1932 г. ц. 25 к.
КАМСАМОЛ — ШЭФ АВІЯЦЫІ. 1932 год. ц. 10 к.
ЗАРЗАР В. Даёш савецкі дырыжабль! 1931 г. ц. 10 к.
ХРЫПІН В. Наш паветраны флёт. 1932 г. ц. 20 кап.
САМАЛЁТ, АВІЯЦЫЯ І АВІЯМАДЭЛІЗМ (літаратура для авіягурткоў).
ЖАВРОЎ А. Як пабудован самалёт і як ён лятае. 1932 г. ц. 30 к.
РАЗАНАЎ А. Самалёт. 1931 г. ц. 35 к.
БУРЧЭ Р. Ф. Паветраны флёт і ваенная маскіроўка. 1933 г. ц. 45 к.
СУДНІК В. Як людзі завалявалі паветра. 1928 г. ц. 20 к.
КАЗІН Н. Авіямадэлізм. Будова лятаючых мадэляў. Работа з лятаючымі мадэлямі. 1932 г., ц. 1 руб.
ВЫВУЧАЙ МЭХАНІКУ І МАТОР!
ГЮНТЭР Ганс. Электратэхніка ўсім. 1932 г. ц. 3 руб. 60 к. пер. 90 к.
ДАБАЧ-ЖУЧЭНКА Б. М. (праф.). Даведнік маладога мэханіка. (У дапамогу маладому рабочаму). 1933 г. ц. 2 р. 50 к. (у пераплёце).
НАРЫСЫ, АПАВЯДАНЬНІ І УСПАМІНЫ ЛЁТНІКАЎ.
БАБУНОЎ А. Гудуць маторы. (Нарысы аб авіяцыі) 1932 г. ц. 1 р. 75 к.
БУРЧЭ К. Ф. Прыгоды і паветрэ. Нарысы і ўспаміны лётнікаў. 1932 г. ц. 1 р.
КАЛЬЦОЎ Міх. Хачу лятаць. 1932 г. ц. 20 к.
КАСЬЦЕРЫН А. Лік. 1930 г. цана 12 к.
СТЭРЛІГАЎ Ул. Я самалёце ў Амэрыку. 1931 г. ц. 35 к.
ПАТРАБУЙЦЕ ва ўсіх кнігарнях і кіёсках ДВБ, БАКТу, РСС і Саюздруку!
З накладнай аплатай літаратуру высылае „Кніга-пошта" (гор. Менск, Ленінская, 15, Цэнтр. кнігарня ДВБ).
АВІЯЦЫЙНАЯ ФАНТАСТЫКА. (Раманы і апавяданьні).
БУДАНЦОЎ С. Ёскадрыльля сусьветнай камуны. 1930 г. ц. 12 к.
ГЕЛЬДЭРС М. Паветраная вайна 1936 году. (Зруйнаваньне Парыжу) (Раман, 1932 г. ц. 1 руб. 50 к.
УЭЛЬС Г. Вайна ў паветры. (Фантастычны раман). 1931 г. ц. 1 р. 50 к.
НА МОВАХ НАЦМЕНШАСЬЦЯЎ.
На яўрэйскай мове:
ЗАРЗАР. Даёш савецкі дырыжабль! (ЦВН, Масква) 1931 г. ц. 7 к.
СЯМАШКА. За савецкі дырыжабль. (ЦВН, Менск) 1931 г. ц. 3 к.
ЖАВРАЎ. Як пабудован самал